ЯК СТВАРАЎ КНІГІ АЛЕСЬ АДАМОВІЧ

8

МЁД ПРАВІЛЬНЫ І НЯПРАВІЛЬНЫ

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ВЕРАСНЯ 2022 г. СУБОТА № 173 (29795)

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:

«Сёння ўзровень падрыхтоўкі рабочых спецыялістаў у нас вельмі высокі. Ёсць шэраг каледжаў, у якіх сярэдні бал атэстата пры паступленні сёлета быў «10», гэта значыць, каб паступіць у каледж, сярэдні бал атэстата ў вучня пасля 9 класаў павінен быць «10». Напрыклад, гэта каледж мікраэлектронікі пры БДУІР, і мы бачым, што на гэтыя спецыяльнасці ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў узрастае вельмі сур'ёзна — гэта круглыя выдатнікі, таму стэрэатып, які існуе ў грамадстве, што ў каледжы ідуць людзі, у якіх ніжэйшы ўзровень ведаў, чым у тых, хто паступае ва ўніверсітэт, проста няправільны. Таму што па цэлым шэрагу спецыяльнасцяў гэта вельмі моцныя, падрыхтаваныя абітурыенты, якія хочуць атрымаць сур'ёзную адукацыю».

КАРАТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Брэсцкую вобласць, удзельнікаў і гасцей абласнога фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2022» у аграгарадку Целяханы з паспяховым завяршэннем уборачнай кампаніі.
- **Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў асабовы састаў і ветэранаў 336-й рэактыўнай артылерыйскай брыгады з 50-годдзем з дня стварэння.**
- Першая цырымонія развітання з піянерскім гальштукам адбудзецца ў Мінску 5 верасня.
- **МТЗ плануе пачаць вытворчасць трактароў з газавым рухавіком.**
- Цэнтр сацыяльнай адаптацыі для інвалідаў адкрыўся ў Лепелі.

ISSN 1990 — 763X

КОЛЕР НАСТРОЮ СВЯТОЧНЫ!

Удзельнікам і гасцям Дня беларускага пісьменства

Паважаныя сябры!

Сардэчна віншую вас з Днём беларускага пісьменства, які сёлета сабраў сяброў на славутай гомельскай зямлі — у гасцінным Добрушы.

Гэтае свята стала сапраўды народным, сімвалам адзінства славян, умацавання духоўных каштоўнасцяў, якія вучаць памятаць пра свае вытокі, шчыра любіць родны край і паважаць продкаў. Менавіта пісьменства з'ядноўвае мінулае, цяперашняе і будучыню, зберагаючы, як найвялікшы скарб, сувязь пакаленняў.

Беларусы заўсёды шанавалі пісьмовае слова, пачатак якому на нашай зямлі далі Еўфрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі і якое 505 гадоў таму Францыск Скарына аздобіў у друкаваную кнігу. Слаўныя традыцыі продкаў-асветнікаў годна працягвалі Янка Купала і Якуб Колас, Максім Багдановіч і Уладзімір Караткевіч, Іван Мележ і Іван Шамякін, на малой радзіме якога праходзіць мерапрыемства.

Непахісная вера, багатая культурная спадчына і шчырае, таленавітае, праўдзівае слова здольныя захаваць згоду між народамі і дараваць усім надзею на найлепшае. У гэтым перш за ўсё найвялікшае прызначэнне Дня беларускага пісьменства.

Жадаю ўдзельнікам і гасцям свята моцнага здароўя, жыццёвай мудрасці, дабрабыту, натхнення і плёну ў працы, мірнага неба і асабістага шчасця.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Чацвёрты раз Гомельшчыне выпаў гонар прымаць удзельнікаў і гасцей Дня беларускага пісьменства. У розныя гады сталіцамі агульнанацыянальнага свята беларускага друкаванага слова ў рэгіёне станавіліся Тураў, Хойнікі, Рагачоў. І вось цяпер Добруш — малая радзіма народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, цэнтр культурнага прыцягнення, дзе можна ацаніць усе знакавыя дасягненні нацыянальнай літаратуры, кнігадрукавання, гістарычнай навукі і асветніцкай дзейнасці, музейнай справы і нацыянальнай культуры ўвогуле. СТАР. 3

Фота Андрэя ФЕАКІСТАВА.

Духоўныя каштоўнасці

ЧАЛАВЕК З УМЕННЕМ МЫСЛІЦЬ СУПРАЦЬ ЧАЛАВЕКА-ФУНКЦЫІ

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Як літаратура павінна адказваць на выклікі рэчаіснасці

У кожнага свае крытэрыі выбару кніг. А кнігі ў сваю чаргу вельмі па-рознаму ўздзейнічаюць на чалавека, яго душу. Таму так важна, каб праз літаратуру (незалежна, класічную ці сучасную) транслiраваліся вечныя каштоўнасці. Напярэдадні Дня беларускага пісьменства Міністэрства інфармацыі сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі арганізавалі Міжнародны круглы стол «Вечныя каштоўнасці праз кнігі. У аснове справядлівасць». Больш за 50 экспертаў з сямі краін свету прынялі ўдзел у дыскусіі, каб знайсці адказы на пытанні, як у наш няпросты час фарміраваць асобу чалавека, здольнага разважаць над тым, што адбываецца, цаніць і берагчы сваё... СТАР. 4

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ТЭМА ЎРОКА — ДАЛЕЙШАЯ МАДЭРНІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ»

Працягваецца серыя рабочых візітаў Прэзідэнта па рэгіёнах краіны Гэтым разам Аляксандр Лукашэнка наведаў Крупскі раён Мінскай вобласці. Ізноў у цэнтры ўвагі — сельская гаспадарка. Кіраўнік дзяржавы наведаў ААТ «Агракамбінат Дзяржынскі». Ён азнаёміўся з вытворчымі магчымасцямі прадпрыемства і перспектывамі яго развіцця. Прэзідэнту паказалі новае аддзяленне па адкорме куранят-бройлераў, мясапераапрацоўчы цэх вытворчай пляцоўкі побач з вёскай Дворышча.

«Тэма сённяшняга ўрока — далейшая мадэрнізацыя сельскай гаспадаркі. Падтэма — выратаванне тых, хто тоне», — адразу абазначыў Прэзідэнт. І першае пытанне на гэтым «уроку» ён адрасаваў намесніку прэм'-ер-міністра Леаніду Зайцу — аб яго ацэнцы работы аграсектара ў Крупскім раёне. Віцэ-прэм'ер назваў яе добрай, прывёўшы адпаведныя паказчыкі росту. Значна павысілася і эфектыўнасць работы на землях, якія былі перададзены агракамбінату «Дзяржынскі». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што палова сельскіх гаспадарак краіны працуе добра. Чвэрць гаспадарак пры належнай дапамозе і падтрымцы развіваюцца. Яшчэ адну чвэрць гаспадарак кіраўнік дзяржавы назваў «забітымі». Па яго словах, іх трэба выратаваць, паколькі там ёсць людзі, якія хочуць працаваць. Аляксандр Лукашэнка назваў некалькі шляхоў рэалізацыі гэтай праблемы.

Адзін з іх прадугледжвае аб'яднанне сельгаспрадпрыемстваў і стварэнне новых гаспадарак фактычна з нуля. У прыклад Прэзідэнт прывёў ААТ «Мінскаблагрэсрвіс» у Мядзельскім раёне, які наведаў месяц таму. Таксама для выратавання некаторых гаспадарак іх будуць перадаваць прамыслоўым прадпрыемствам. Для Беларусі гэта ўжо не новая практыка, ёсць адпаведны вопыт. «Ад гэтага нікуды не дзенешся, і гэта справядліва. Усё ж такі прампрадпрыемствы выпампоўваюць людзей з вёскі. Таму даўгі трэба аддаваць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Адпаведныя падыходы кіраўнік дзяржавы нядаўна ўзгадніў у Гомельскай вобласці. Ён падкрэсліў, што далучаць стратныя гаспадаркі да прампрадпрыемстваў будзем прадаўжаць і ў далейшым.

Крупскі раён паказвае і трэці шлях аднаўлення сельгаспрадпрыемстваў. Ён заключаецца ў супадзенні інтарэсаў. У раёне былі землі, якія не давалі належнага выніку. А ў Мінскай вобласці працаваў буйны перапрацоўшчык і вытворца — агракамбінат «Дзяржынскі». Яму былі патрэбны дадатковыя сельгасугоддзі для вытворчасці прадукцыі, кармоў для патрэб птушкагадоўлі і жывёлагадоўлі. Замест закупкі па імпарце прадпрыемства ўзяло землі ў Крупскім раёне і наладзіла там эфектыўную вытворчасць.

«Птушку сенажом і сіласам не накорміш. Кіраўнік мог бы закупляць гэтае зерне недзе ў Расіі і жыў бы прыпяваючы. Але ў чым яго каштоўнасць — землі пачалі даваць аддачу. Разворвай, атрымлівай збожжа і кармі курэй», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што пры ўздыме гэтых 25 працэнтаў «забітых» гаспадарак перш за ўсё — кантроль з боку віцэ-прэм'ера і Камітэта дзяржаўнага кантролю. «Ніякага збожжа з боку мы закупляць не павінны. У нас хапае зямлі для таго, каб вырошчваць тут збожжа, карміць птушку, свіней, перапрацоўваць гэтае зерне ў добрыя камбікармы і карміць жывёлу. Атрымліваць мяса, малако. Вось простая арыфметыка», — растлумачыў Прэзідэнт. У Крупскім раёне менавіта такім чынам і ідзе работа. Аляксандр Лукашэнка завастрыў увагу, што гэта добры шлях і добрая справа. Ён падкрэсліў, што такім чынам вырашаецца і дзяржаўная задача.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што ў гэтым хаваецца адна з галоўных прычын, чаму ён выступае за захаванне і развіццё буйнатаварных гаспадарак, так званых калгасаў і саўгасаў. «Кіраўніку агракамбіната патрэбна зямля. А нам трэба, каб ён і людзей глядзеў. Чаму я трымаюся за буйнатаварныя гаспадаркі — калгасы, саўгасы, таму што яны выконваюць сацыяльную функцыю, утрымліваюць вёску. І мы тут ствараем аграгарадкі. Гэта працэс працяглы. Мы будзем тут доўга яшчэ працаваць, каб дарогі былі добрыя, гандаль быў, дзіцячыя садкі, школы і гэтак далей. Яны цягнуць на сабе гэтую сацыялку. Таму для мяне кіраўнікі прадпрыемстваў — людзі дзяржаўныя. Мы за іх трымаемся», — адзначыў беларускі лідар. Ён заўважыў, што гэта не азначае, што нельга ствараць фермерскія гаспадаркі. Калі будуць фермеры — можна раздаць землі і ім. Але фермер можа не несці сацыяльную нагрузку. І гэта мае значэнне.

«У нас і фермеры нясуць гэту сацыяльную нагрузку. Таксама малайцы. Таму што ў нас такая палітыка ў дзяржаве: хочаш забрацъ землі ўчарашняга калгаса — калі ласка, з вёскай, вытворчымі памяшканнямі, даводзь да розуму, працуй. Вось палітыка ў вёсцы. Гэтым самым мы падымаем, ратуем вёску і даём работу людзям на зямлі. Так павінна быць. Гэта наша палітыка ў сельскай гаспадарцы», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў гэтай сферы неабходны кантроль, каб не атрымаць негатыўныя прыклады дзяльбы зямель, як у некаторых суседзяў, у прыватнасці ва Украіне. Ён акцэнтаваў увагу, што кантроль патрэбны паўсюль, у тым ліку гэта датычыцца і фермераў.

«Я не хачу, каб фермеры, пачуўшы гэта, падумалі, што мы супраць іх. Не, калі ласка. Калі б прыехалі сюды фермеры замест яго (агракамбіната), 40 працэнтаў гэтых земляў узялі ў раёне, людзям далі працу, жыллё будавалі, дапамагалі, стваралі такую вытворчую базу... Калі ласка, мы рады былі б!» — сказаў Прэзідэнт.

Ён нагадаў аб сваім даручэнні, дадзеным падчас рабочай паездкі ў Гродзенскую вобласць, аб зніжэнні кошту будаўніцтва жылля ў вёсцы. «Трэба будаваць жыллё і прыцягваць людзей сюды», — сказаў кіраўнік краіны. З гэтага вынікае і кадравае пытанне, на якое звярнуў увагу Прэзідэнт. Ён зрабіў акцэнт на працоўнай дысцыпліне і недапушчэнні расхлябанасці. Таксама беларускі лідар заўважыў, што кіраўнікі прадпрыемстваў павінны канцэнтраваць прыём і звальненне спецыялістаў. «Атрымаў адукацыю за кошт дзяржавы — калі ласка, працуй. Гэта не прыгоннае права. Але калі мы хочам захаваць, выратаваць сябе — гэта пытанне бяспекі, нацыянальных інтарэсаў, незалежнасці. Кадры вырашаюць усё», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

НЕ ТРЭБА РВАЦЬ КІПЦЮРЫ, КАБ БЫЛО БОЛЬШ ЗБОЖЖА

Кіраўнік дзяржавы спытаў у міністра сельскай гаспадаркі Ігара Брыло, колькі ўраджаю сабрана на раніцу пятніцы. Міністр далажыў, што ў краіне засталося ўбрацъ менш як тры працэнты плошчаў. Ураджай збожжавых і зернебабовых, як плануецца, будзе не менш як 10,7 мільёна тон. «Мы завастрылі ўсіх: збожжа, збожжа, збожжа. Але кукурузу трэба паглядзець. Трэба, каб быў кукурузны сілас. Не трэба гнаць да 11 млн тон збожжа. Трэба акуратна разабрацца, што нам трэба ад кукурузы: ці збожжа, ці пакласці добры сілас. Проста не трэба рваць кіпцюры для таго, каб больш, больш, больш збожжа, і мы будзем выхваляцца. Разумна падыходзіць», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што сёлета можна сабрацъ 11 мільёнаў зерня, але пытанне — ці трэба. Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу на аператыўную сяўбу азімых: «Мы зразумелі, што азімыя трэба сеяць, павялічваць; павялічваць плошчы».

Яшчэ адно не менш важнае пытанне — уздым ільнотрасты. Аляксандр Лукашэнка расказаў пра свае планы ў канцы восені наведаць Аршанскі льнокамбінат, дзе і будзе абмеркавана гэта пытанне.

Асобна кіраўнік краіны звярнуў увагу на неабходнасць нарыхтоўкі якасных кармоў. «Гэты год трэба зрабіць базавым, вызначальным, і мы будзем тады і ў далейшым лічыць працэнты ўраджайнасці, выходзячы з гэтага года, таму што гэта нядрэнны год», — сказаў ён.

ТРЭБА ЎЗБУЙНЯЦЦА

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся перспектывамі развіцця агракамбіната «Дзяржынскі». Генеральны дырэктар агракамбіната Уладзімір Лук'янаў расказаў, што запланавана будаўніцтва новых малочнатаварных ферм, завода па перапрацоўцы нехарчовай жывёльнай сыравіны, аб'ектаў па вырошчванні мяса індычкі. На агракамбінаце плануюць да 2025 года наладзіць штогадовую вытворчасць 110 тысяч тон мяса птушкі цыплят-бройлераў, 6 тысяч тон мяса індычкі і 91 мільён яек. Гендырэктар агракамбіната расказаў, што ў перспектыве кампанія павінна выйсці на мільярд рублёў.

Кіраўнік дзяржавы таксама задаў пытанне, ці ёсць на рынку попыт на птушку і ці будзе ён павялічвацца. Уладзімір Лук'янаў адказаў, што праблем з попытам на прадукцыю няма як унутры краіны, так і за мяжой. І ён пастаянна расце. На гэта Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што, калі няма праблем са збытам, трэба павышаць рэнтабельнасць продажу, а для гэтага неабходна пашыраць вытворчасць. «Трэба ўзбуйняцца. Гэта не варта зацягваць. Калі ты некуды вока паложыш, мы імгненна прымем рашэнне», — канстатаваў ён.

Прэзідэнт наведаў і мясапераапрацоўчы цэх. Яму далажылі аб стане і перспектывах развіцця АПК Мінскай вобласці, у тым ліку інтэграцыйных структур. Губернатар Мінскай вобласці Аляксандр Турчын прапанаваў 50 працэнтаў сродкаў з інавацыйнага фонду Мінскага аблвыканкама накіроўваць на фінансаванне інвестыцыйных праектаў, такіх як у Крупскім раёне. Тут збіраюцца будаваць дадатковыя птушнікі. Аляксандр Лукашэнка адказаў, што гэта цалкам магчыма. Ён даручыў пры бюджэтным планаванні на наступны год разгледзець і ўлічыць адпаведныя пытанні.

Валерыя СЦЯЦКО,
Крупскі раён.

У тэму

Пакуль усё атрымліваецца

Генеральны дырэктар агракамбіната Уладзімір ЛУК'ЯНАЎ расказаў журналістам, што прадпрыемства ідзе па тым шляху, каб маштабавацца і стаць іграком не толькі ў краіне, але і на іншых рынках. Сёння гэта атрымліваецца. «Агракамбінат выходзіць на 100 тысяч тон вытворчасці мяса птушкі, мы не забываемся пра землі, пра кармы для ўласнага забеспячэння. Таму задачы, якія перад намі пастаўлены, і бачанне нас як інтэграцыйнай структуры пакуль атрымліваюцца», — расказаў Уладзімір Лук'янаў. У агракамбіната, які размешчаны ў васьмі раёнах Мінскай вобласці, да 2025 года запланаваны чатыры інвестпраекты. Адзін з іх — будаўніцтва дадатковых птушнікаў, паколькі перад прадпрыемствам стаіць задача дадаць яшчэ 20 тысяч тон мяса птушкі, зараз яно вырабляе 100 тысяч тон. «У нас заканчваецца праект у Капыльскім раёне, гэта поўны замкнёны цыкл вырошчвання і перапрацоўкі мяса індычкі, якое мы будзем запускаць у снежні. Чым унікальны праект? Гэта 500 працоўных месцаў для Капыльскага раёна плюс магчымасць павелічэння аб'ёму да 20 тысяч тон, гэта і выручка, і дадатковыя інвестыцыі», — падкрэсліў гендырэктар агракамбіната.

«ПАВЫСІЦЬ УЗРОВЕНЬ ГРАМАДЗЯНСКАЙ АДКАЗНАСЦІ»

У Савеце Рэспублікі абмеркавалі будучыню партый і грамадзянскай супольнасці

Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ учора адбылася нарада па абмеркаванні законапраектаў «Аб грамадзянскай супольнасці» і «Аб змене законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў».

Фота БелТА

Сярод удзельнікаў — члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кіраўнікі дзяржаўных органаў і грамадскіх аб'яднанняў.

Адкрываючы нараду, Старшыня верхняй палаты парламента адзначыла, што адпаведныя законапраекты разглядаліся на пасяджэннях экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання, а потым на нарадзе ў Прэзідэнта краіны.

«Прэзідэнт тады звярнуў увагу на тое, што мы павінны навелы, якія прапануецца замацаваць у гэтых законапраектах, яшчэ раз абмеркаваць. Больш за тое, мэтазгодна таксама вынесці гэтыя праекты на грамадскае абмеркаванне. І калі будуць прапановы, Адміністрацыя Прэзідэнта іх акумулюе. І тады мы будзем дакладна разумець, наколькі правільныя нашы дзеянні па прыняцці гэтых законаў», — падкрэсліла старшыня Савета Рэспублікі.

Удзельнікі канстатавалі, што прыняцце законапраекта аб грамадзянскай супольнасці будзе садзейнічаць павышэнню ўзроўню грамадзянскай адказнасці і прававой культуры, уцягненню насельніцтва ў вырашэнне найбольш значных грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных пытанняў, фарміраванню навыкаў па ажыццяўленні канструктыўнай сацыяльна-палітычнай дзейнасці, накіраванай на абарону і прасоўванне нацыянальных інтарэсаў. Таксама адбылося канструктыўнае абмеркаванне асноўных змен у законапраект, які датычыцца палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў.

Як зазначыў **старшыня РГА «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ**, сёння ўдзельнікі яшчэ раз вярнуліся да разгляду гэтых законапраектаў. «Адбылася нарада ў Прэзідэнта, дзе былі адобраны канцэптуальныя асновы гэтых законапраектаў, але засталіся некаторыя пытанні прыватнага парадку. Нам важна вырашыць, які ўзроставы цэнз будзе ў стварэльнікаў, заснавальнікаў палітычных партый, які колькасны склад, таму што ад гэтага будзе залежаць ступень іх уплыву ў беларускім грамадстве і ступень іх палітычнай актыўнасці», — сказаў ён.

Акрамя таго, адзначыў Алег Раманаў, разгледжаны шэраг іншых пытанняў, «каб у першым чытанні заканадаўцы — дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — маглі працаваць з якасным законапраектам, абмяркоўваць і ўносіць свае карэктывы і ў далейшым прымаць гэты законапраект».

Меркаванні

«СПАДАБАЎСЯ СВАБОДНЫ АБМЕН ДУМКАМІ...»

Ангеліна КІРЭЙ і Валерыя СЕДНЕВА вучацца ў 10 гімназіі Гродна. Дзяўчаты з'яўляюцца членамі школьнага медыяцэнтра і мараць стаць журналістамі. Па іх словах, 1 верасня ім запомніцца надоўга, бо ўпершыню ўрок праводзіў не класны кіраўнік, а Прэзідэнт Беларусі. Размова атрымалася насычанай і інфарматыўнай, лічаць гімназісткі.

— Падчас адкрытага ўрока ўздымалася тэма адукацыі, гэта важна для моладзі. У прыватнасці, быў зроблены акцэнт на гісторыю, неабходнасць ведаць мінулае сваёй краіны, каб ісці наперад і будаваць будучыню. Мне гэта вельмі зразумела, бо я з'яўляюся экскурсаводам нашага гімназічнага музея «Беларусь непакорная», — падзялілася Ангеліна *(на фота злева)*. — Музей створаны пры ўдзеле ветэрана вайны Івана Бохана. Самы цікавы экспанат — партызанская зямлянка. На прыкладах гераічнага мінулага, лічу, якраз і выхоўваюцца патрыёты, на тым, чым можна ганарыцца сённяшняму пакаленню. Бо яны здабылі нашу незалежнасць. Падчас адкрытага ўрока Прэзідэнт падкрэсліў, што важна не толькі ведаць гісторыю, але і ўмець яе аналізаваць. У сучасным свеце вельмі вялікі паток інфармацыі, і тут трэба карыстацца праверанымі крыніцамі, не паддавацца на фэйкі.

На думку Ангеліны, атрымалася цікавая дыскусія ў зале. Абстаноўка спрыяла свабоднаму абмену думкамі. Дзяўчыне спадабалася, што Прэзідэнт мог і пажартаваць: «Было відаць, што ўсе прысутныя адчуваюць сябе камфортна. Кожны меў унікальную магчымасць задаць пытанне кіраўніку дзяржавы і атрымаць шчыры і даступны адказ».

На незвычайны фармат звярнула ўвагу і Валерыя. Прэзідэнт у ролі настаўніка мог весці размову на ўсе акрэсленыя тэмы. Што датычыцца адказаў удзельнікаў, яны былі напоўнены эмоцыямі і разам з тым даволі глыбокім сэнсам, лічыць Валерыя.

— Хачу сказаць, што моладзь сёння старэйшая быць актыўнай. Гэта яе сутнасць. Для нас зараз галоўнае — адукацыя, якая не толькі дае веды, але і выхоўвае. У нашай гімназіі якраз і робіцца на гэта акцэнт. У медыяцэнтры мы вучымся здабываць інфармацыю, аналізаваць яе, рабіць высновы. Мне цікава тут займацца.

Валерыя расказала, што напярэдадні Дня народнага адзінства ў гімназіі адкрываецца Цэнтр ідэалагічнага і духоўнага выхавання «Беларусь. Лёс. Айчына», дзейнасць якога будзе скіравана на гарманічнае развіццё асобы, выхаванне патрыётаў. А гэта стрыжань, які неабходны для таго, каб быць адказнымі за сваю краіну. Прэзідэнт спадзяецца на моладзь, і яна не падвядзе, упэўнена старшакласніца.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

«З ГЭТЫМІ ДЗЕЦЬМІ БУДЗЕ ЦІКАВА ПРАЦАВАЦЬ»

За адкрытым урокам «Гістарычная памяць— шлях у будучыню» ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі старшакласнікі сярэдняй школы № 11 Мазыра сачылі разам з настаўнікамі-прадметнікамі, класнымі кіраўнікамі і кіраўніцтвам навучальнай установы па вялікім святлодыёдным экране ў прасторнай актавай зале. Як вучні абмяркоўвалі незвычайны ўрок, падзялілася класны кіраўнік 10 класа, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Ірына КРАСУЛЯ:

— Мяне вельмі ўразіла і кранула, як вучні ўважліва слухалі Прэзідэнта. Яны і на мабільныя тэлефоны забыліся, якія мы не забіралі, але гэта, лічу, паказчык, наколькі дзецям было цікава. Прыемна парадавала, што нашы дзеці палітычна падкаваныя, цікавяцца грамадска-палітычным жыццём і перажываюць за сваю краіну. Многія вучні майго класа, дзе профільнае навучанне «беларуская мова і грамадазнаўства», збіраюцца паступаць на спецыяльнасці сілавых ведамстваў. Пасля адкрытага ўрока ад Прэзідэнта ўжо ў класе самі прапанавалі абмеркаваць гэтую сапраўды падзею ў іх школьным жыцці. Расказалі, якія пытанні, зададзеныя Прэзідэнту, ім больш за ўсё спадабаліся. Падзяліліся, што таксама хацелі б іншым разам адрасаваць свае пытанні Аляксандру Лукашэнку. І мы дамовіліся: дзеці напішуць, што іх хвалюе і што б яны хацелі спытаць у Прэзідэнта. Калі дзяліліся ўражаннямі аб атмасферы сустрэчы, то ўсе мы пагадзіліся: вельмі зачапіла простая, даступная мова Прэзідэнта, трапныя выразы, жарты, якімі кіраўнік дзяржавы выдатна трымаў атмасферу жывой, сапраўды сяброўскай размовы. Клас у мяне зборны, мы яшчэ адзін да аднаго прывыкаем. Але як настаўнік я для сябе адзначыла: тое, як мае вучні адгукнуліся на адкрыты ўрок Прэзідэнта, бы «маячок»: «Так, з гэтымі дзецьмі будзе цікава працаваць!»

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

КОЛЕР НАСТРОЮ — СВЯТОЧНЫ!

МЕСЦА СУСТРЭЧЫ ЗМЯНІЦЬ НЕЛЬГА

Святочныя пляцоўкі пачнуць працаваць сёння з 11 гадзін. На вуліцы князя Паскевіча разгорнуцца гандлёвыя рады, выстава-прэзентацыя турыстычнага патэнцыялу, «Паштовы павільён» і маладзёжная пляцоўка. У скверы непадалёк будзе арганізавана інтэрактыўная зона для дзяцей. На адкрытай пляцоўцы каля фантана падрыхтаваны лакацыі, якія прадставяць установы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Гомельшчыны. У скверы на праспекце Міру разгорнуцца рамесныя рады, дзе можна купіць вырабы мясцовых умельцаў. Тут жа ўсе ахвотныя змогуць далучыцца да цырымоніі адкрыцця помніка ўраджэнцу Добрушскага раёна, вядомаму пісьменніку, сцэнарысту і драматургу — Івану Шамякіну.

ВЕДАЙ ДОБРУШСКІХ!

Падрыхтаваліся здзіўляць удзельнікаў і гасцей Дня беларускага пісьменства прадпрыемствы і арганізацыі горада. У паштовым аддзяленні № 4 адбудзецца цырымонія гашэння канверта з арыгінальнай маркай, прысвечанай XXIX Дню беларускага пісьменства.

Добрушская папяровая фабрыка «Герой працы» запрашае на экскурсіі па музейнай экспазіцыі, прысвечанай 150-годдзю з дня свайго заснавання. Прадпрыемства таксама падрыхтавала выставачны павільён з поўнай лінейкай прадукцыі, у тым ліку і пісчай паперы, якую вырабляе з 1875 года.

Падчас свята можна ацаніць выставу вырабаў Добрушскага фарфоравага завода і набыць навінкі прадукцыі, выпушчанай спецыяльна да Дня беларускага пісьменства. Прадпрыемства запрашае гасцей на майстар-класы па роспісе посуду.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ

У цэнтры горада каля мемарыяльнага комплексу «Памяць» рыхтуецца рэканструкцыя «Баі за Добруш 1943 года. Партызанскі супраціў», падрыхтаваная ваенна-гістарычным клубным аб'яднаннем «Гонар мундзіра». Рэканструкцыя — напамін аб падзеях 1943 года, якія папярэднічалі вызваленню Гомельскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тут жа, на набярэжнай, разгорнецца мабільны музей «Дарога памяці» ад Беларускага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. На тэрыторыі Добрушскай сярэдняй школы № 1 можна ацаніць інтэрактыўную экспазіцыю «Памяць пакаленняў», сабраную музеямі баявой славы ўстаноў адукацыі Гомельшчыны.

ЛІТАРАТУРНЫ БАМОНД

Пазнаёміцца з беларускімі пісьменнікамі і атрымаць аўтографы, паўдзельнічаць у паэтычных чытаннях, купіць кнігі, сувеніры, у тым ліку са зніжкамі, удзельнікі і госці Дня беларускага пісьменства змогуць на Фестывалі кнігі і прэсы. У сквер па праспекце Міру запрашаюць пляцоўкі самых розных літаратурных праектаў. Сярод іх — «Брыльянты стагоддзя» да 100-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, літаратурны салон пісьменнікаў Гомельшчыны «Святло каштоўнасцяў духоўных» і літаратурныя падворкі «Гомельшчына літаратурная», дзе пройдзе прэзентацыя найлепшых праектаў бібліятэк. Будзе прадстаўлены таксама выставачны праект «Песняры зямлі беларускай» Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа і Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

На галоўнай плошчы горада з 20 да 22 гадзін адбудзецца святочны канцэрт і ўзнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальная літаратурная прэмія».

ТРАДЫЦЫІ СВЯТА

Святочнай службай у храме Свяціцеля Мікалая Цудатворца і хрэсным ходам удзельнікаў рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да Святыняў» працягнецца святкаванне Дня беларускага пісьменства ў Добрушы 4 верасня. Другі святочны дзень запросіць на прэзентацыю літаратурна-патрыятычнага праекта Саюза пісьменнікаў Беларусі «Бачу Беларусь такой».

У ДАРОГУ З КЛАСІКАМІ

Дарэчы, у атмасферу Дня беларускага пісьменства дапаможа акунуцца транспарт, арганізаваны для падвозу ўдзельнікаў і гасцей святочнай праграмы. На лінію Гомель — Добруш накіраваны дызель-цягнікі, упрыгожаныя цытатамі і партрэтамі вядомых беларускіх пісьменнікаў. «Літаратурны» трансфер дапаможа ў самы кароткі тэрмін дабрацца да Добруша і вярнуцца ў абласны цэнтр пасля заканчэння праграмы. Для зручнасці гасцей арганізаваныя таксама дадатковыя аўтобусы, якія будуць дастаўляць людзей з чыгуначнай станцыі ў райцэнтры. Добруш на Дні пісьменства арганізаваў і пяць парковак, дзякуючы якім прыехаць на свята ўсе ахвотныя могуць на ўласным аўтатранспарце. Іх размяшчэнне сінхранізуюць з рухам грамадскага транспарту, а напрамак руху да парковак укажуць дарожныя знакі. На ўсёй гарадской зоне правядзення святочных мерапрыемстваў і на пад'язных шляхах да горада, як з боку Гомеля, так і Расійскай Федэрацыі, арганізавана дзяжурства праваахоўнікаў. Супрацоўнікі ДАІ дапамогуць арыентавацца ў напрамку руху да святочных пляцовак. Дзяжурства будуць несці і дружыннікі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, *г. Добруш.*

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пуцін: мэта спецаперацыі ва Украіне — ліквідацыя антырасійскага анклаву

Уладзімір Пуцін расказаў аб стварэнні антырасійскага анклаву ва Украіне, які пагражае Расіі. Паводле яго слоў, таму цяпер там праводзіцца спецыяльная ваенная аперацыя, каб абараніць і жыхароў Данбаса, і жыхароў Расіі. Аб гэтым піша РІА «Навіны».

«На тэрыторыі сённяшняй Украіны пачалі ствараць антырасійскі анклаў, які пагражае нашай краіне, таму хлопцы нашы, якія ваююць там, абараняюць жыхароў Данбаса і саму Расію. Безумоўна, гэта заслугоўвае ўсялякай падтрымкі з боку грамадства. Гэта вельмі важна. І з боку маладых людзей. Таму што хлопцы, якія ваююць там, рызыкуюць сваім здароўем, а многія гінуць. Яны павінны разумець, за што яны аддаюць сваё жыццё — за Расію і за людзей, якія на Данбасе жывуць», — падкрэсліў расійскі прэзідэнт у час адкрытага ўрока «Размова аб важным» у Калінінградзе.

У Крамлі ацанілі прыбыццё місіі МАГАТЭ на Запарожскую АЭС

Прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў пракаментаваў прыбыццё місіі Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі на Запарожскую атамную электрастанцыю.

«Пакуль рана даваць ацэнку. У цэлым мы вельмі пазітыўна ацэньваем той факт, што, нягледзячы на ўсе складанасці і праблемы, звязаныя ў тым ліку з правакацыямі ўкраінскага боку, гэтая місія прыбыла і прыступіла да работы. Галоўнае, што місія там. Місія павінна даць ацэнку па стане станцыі і па пытаннях, звязаных з ядзернай бяспекай», — сказаў прадстаўнік Крамля. Дэлегацыя экспертаў Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі прыбыла на Запарожскую атамную электрастанцыю днём 1 верасня.

Як паведамляецца, два супрацоўнікі агенцтва застануцца на тэрыторыі ЗАЭС на пастаяннай аснове.

У палітыку — з чыстымі лапамі: ката Лары вылучылі ў прэм'еры Брытаніі

Перадвыбарная гонка ў Брытаніі выйшла на фінішную прамую. Ужо ў пачатку наступнага тыдня, 5 верасня, будзе аб'яўлена імя новага старшыні Кансерватыўнай партыі, які зменіць на прэм'ерскай пасадзе Барыса Джонсана.

Дэлегатам-торы трэба будзе выбраць паміж міністрам замежных спраў Ліз Трас (яе называюць фаварытам) і экс-канцлерам казначэйства (міністэрская пасада ў кабміне, якая адказвае за фінансавыя пытанні) Рышы Сунакам.

Але нечакана ў гонку ўварваўся на мяккіх лапках трэці «кандыдат» — галоўны мышалоў Даўнінг-стрыт, 10, знакаміты кот Лары. Плакаты з Трас, Сунакам і Лары можна бачыць па ўсім Лондане. Жартоўную выбарчую кампанію запусціла крэатыўнае агенцтва Don't Panic London. У ёй праглядаецца не толькі англійскі гумар, але і палітычная сатыра. «Чаму новага агульнанацыянальнага лідара павінны выбіраць 160 тысяч торы, навязваючы сваё рашэнне 67 мільёнам чалавек (і 34 мільёнам хатніх гадаванцаў)?!» — абураецца кот.

Карэспандэнты накіравалі містару Лары запыт аб інтэрв'ю, аднак пакуль не атрымалі адказу — відавочна, з-за вялікай загружанасці кандыдата, якога ніхто не вызваляў ад галоўнага абавязку — палявання за мышамі ў прэм'ерскай рэзідэнцыі. Жарты жартамі, але вось ужо 11 гадоў Лары нязменна займае пасаду галоўнага мышалова кабміна (Chief Mouser to the Cabinet Office), якая афіцыйна пазначана на сайце ўрада Брытаніі.

ЧАЛАВЕК З УМЕННЕМ МЫСЛІЦЬ СУПРАЦЬ ЧАЛАВЕКА-ФУНКЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Мы дамовіліся гаварыць пра тое, што набалела. Таму будзем фарміраваць праблемны парадак дня, каб супольна знаходзіць адказы на актуальныя выклікі, — задаў тон сустрэчы **міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПЯРЦОЎ**. — Мне здаецца, мы выпрацавалі добрую форму ўзаемадзеяння. У мінулым годзе наш круглы стол прайшоў вельмі і вельмі прадукцыйна. Нават у эпоху каранавірусных абмежаванняў, якія былі ў мінулым і пазамінулым годзе.

Тэма сёлетняга круглага стала нарадзілася на Санкт-Пецярбургскім кніжным форуме, дзе абмяркоўвалі, як праз класічнае слова і літаратуру фарміраваць светапогляд сучаснага чалавека. Але ў Беларусі мы ўжо займаемся дадзенай праблемай, і ў нас ёсць спіс сацыяльна значнай літаратуры, які разам з абласнымі выканаўчымі камітэтамі і Міністэрствам інфармацыі фарміруем штогод. Туды ўваходзяць класічныя творы і творы сучасных аўтараў, якія могуць выхаваць чалавека, грамадзяніна і патрыёта. У іншых краінах, я ведаю, па-рознаму рухаюцца да вырашэння гэтага пытання. Але прыемна, што праца вядзецца ў адным напрамку — бо перад намі стаяць аднолькавыя выклікі. І гэтыя выклікі нам пасылаюць лічбавыя гіганты, уладальнікі новага капіталу і тэхналогій, для якіх галоўнае — стварыць не думаючага чалавека, не чалавека з высокім узроўнем адукацыі, з шырокім кругаглядам, а чалавека коснаязыкага, які тлумачыцца смс-камі, эмодзі ў сацсетках. За гэтым прасочваецца нечая задача — пераўтварыць чалавека з уменнем мысліць у чалавека-функцыю, які будзе валодаць не ведамі, а ўменнямі і будзе выконваць тое, што патрэбна вялікім карпарацыям. Кіраваць аўтамабілем, рабіць невялікія рухі на працы, браць крэдыты, жыць у стандартных дамах і глядзець стандартнае кіно і чытаць такую ж літаратуру невысокага мастацкага сэнсу і вартасці. Такі атрымліваецца замкнёны свет-бурбалка, дзе стане, не дай бог, жыць грамадства, якое прыйдзе нават на змену нашаму пакаленню. Магу сказаць, што гэта вельмі сур'ёзны выклік. Але з гісторыі мы ведаем, што нішто не магло супрацьстаяць класічнаму слову і класічнай кнізе, якія заўсёды былі запатрабаванымі, у любую эпоху, нават у часы дэсакралізацыі, абясцэньвання друкаванага слова.

Перакананы, што так будзе і зараз, і ў будучыні. Мы павінны абмеркаваць, як нам рухацца і як папулярызаваць кнігу, асабліва ў маладога пакалення, якое лянуецца чытаць і з прычыны свайго новага лічбавага атачэння не разумее часам, пра што пішацца ў вартых кнігах. Летась мы знайшлі падыход і рэалізавалі яго — гэта дадатак «Чытанка», які папаўняецца рознымі творамі беларускіх класікаў і сучасных пісьменнікаў. Але я думаю, што гэтага недастаткова...

Міністр заклікаў прысутных не толькі дзяліцца думкамі адносна акрэсленых праблем, але і ўносіць прапановы пра тое, як агулам змяняць сітуацыю, якімі крокамі і інструментамі паказваць малады людзям, што мае сапраўдную вагу і з'яўляецца дзейснымі арыенцірамі. Так, у спіс, рэкамендаваны Міністэрствам інфармацыі для прачытання, увайшло 12 кніг, сярод якіх класікі як беларускай, так і замежнай літаратуры. Кожны з твораў не толькі дае магчымасць назіраць пэўныя гісторыі, але і дазваляе вучыцца на ўчынках іх герояў, як годна дзейнічаць у самых розных сітуацыях.

— Парадак дня, які прапанаваны сёння для разгляду, вельмі важны. Бо мы знаходзімся ў пошуку: на што можам абапірацца і што сёння запатрабавана ў грамадстве, — адзначыў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ**. — І ў рэкамендацыйны спіс, які прапрацоўваўся Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, трапілі творы, якія прайшлі ўжо адбор і асэнсаванне дзесяцігоддзямі. Там самыя розныя кнігі. Шукаць справядлівасць ва ўчынках іх герояў ці ў пазіцыі аўтараў, безумоўна, — няпростая задача. Калі я збіраўся сюды, то перачытаў некаторыя з гэтых твораў: «Майстра і Маргарыту», «Авадня» і «Блакадную кнігу». І, ведаеце, зразумеў, што зачараванне юнацкае ў дачыненні да некаторых старонак ці твораў у цэлым мінае. Але чарговы раз уразіла «Блакадная кніга», аўтарамі якой з'яўляюцца два вялікія пісьменнікі Данііл Гранін і Алесь Адамовіч. Кніга пачала стварацца ў 70-я гады, і адбывалася тое няпроста. Дзве маштабныя асобы не пабаяліся ўзяцца за тэму, якая, здавалася б, ужо была раскрыта. Не пабаяліся саперніцтва пазіцый, фактаў, думак і адкрыццяў. Гэтая кніга сёння важная і для нашай краіны, таму што ў нас вядзецца шырокая праца публіцыстамі, пісьменнікамі, журналістамі, Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь па аднаўленні ўсіх фактаў генацыду беларускага народа. Асэнсоўваючы, што ж такое справядлівасць у мастацкім фармаце, усім нам трэба зазірнуць у папярэднія дзесяцігоддзі, у перыяд Вялікай Айчыннай вайны, у той перыяд, калі частка беларускага народа прыціскалася палякамі, і зразумець, што ж мы згубілі. Колькі мы ў тыя трагічныя моманты нашай гісторыі страцілі людзей, тых, хто мог бы ствараць творы мастацтва, пісаць новыя кнігі. І калі сёння мы сваім мастацкім словам не паспрабуем асэнсаваць тую трагедыю, аднавіць гістарычную праўду пра спаленыя вёскі і страчаных людзей, хоць бы па аповедах сведкаў і па дакументах, якія знайшла Генеральная пракуратура, калі не зможам пра гэта распавесці наступным пакаленням, то мы згубім частку саміх сябе і частку будучыні. Таму я прашу: давайце разам задумаемся

аб тым, што складае маральную аснову справядлівай і сапраўднай літаратуры.

У сваю чаргу **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ** патлумачыў, як важна ў наш час заахвоціць усіх, асабліва маладых, да чытання добрай і якаснай мастацкай літаратуры, паколькі часта адбываецца так, што за колькасцю губляецца сэнс.

— Вы як прафесіяналы, як людзі, якія самі пішуць кнігі, ведаеце, наколькі сёння іх многа і становіцца ўсё больш, у тым ліку і ў электронным аўдыяфармаце. Але ці гэта добра, калі мы проста адзначаем, што ў нас моладзь чытае кнігі? Часта я заўважаю, што лепш бы яны не чыталі тое, што чытаюць сёння. Менавіта таму мы азадачыліся пытаннем: а якія павінны быць кнігі, што трапляюць да чытача? Нас натхніла выказванне Прэзідэнта: «У аснове ўсяго, што я раблю, ляжыць справядлівасць». І мы гэты пасыл зрабілі загалоўнай цытатай у праекце «Кніжная паліца», — кажа Ігар Бузоўскі. — Задумка такая — агучыць нашы галоўныя духоўныя каштоўнасці. Бо вось мы кажам, што ў нас існуюць традыцыйныя, сямейныя каштоўнасці, а ў чым іх сутнасць, ніхто не тлумачыць. Давайце дамовімся, на чым базіруецца наша дзяржаўнасць, наша слова пісьменніцкае, што мы хочам прасоўваць? Калі гэта сямейныя каштоўнасці, то давайце задумаемся, што гэта, бо спатрэбілася выносіць на ўзровень Канстытуцыі нават пытанне, што сям'я — гэта саюз жанчыны і мужчыны, дзе ёсць мама і тата. І калі гэта трэба на такім узроўні рабіць, то неад'емная частка працы пісьменнікаў — растлумачыць, што такое справядлівасць, сям'я, адказнасць, працавітасць і многае іншае. Але разам з тым хочацца пачуць, якія каштоўнасці сёння павінны быць у аснове дзяржавы, каб узяць гэта за арыенцір для фарміравання наступнай «Кніжнай паліцы».

Сваю пазіцыю выказаў і **народны пісьменнік Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ**. Яго раман «Вам заданне» якраз трапіў у спіс рэкамендаваных кніг, а сам аўтар сцвярджае, што ўсім нам важна знайсці свой адказ, што для нас справядлівасць і як жыць у адпаведнасці з яе законамі.

— Я паспрабаваў пашукаць тлумачэнне паняццю «справядлівасць», і атрымліваецца, што мы з вамі ўсё правільна разумеем. Бо калі ўзяць палітыку, то нельга прызнаць справядлівым падзел свету на сённяшні дзень. Паколькі будуецца ўсё на прынцыпе аднапалярнага свету, дзе мэта — падпарадкаваць адной дзяржаве ўсе астатнія. Альбо ў эканамічнай навуцы — гэта падзел абмежаванага рэсурсу, — кажа Мікалай Іванавіч. — Чалавек можа паступацца ўласнымі жаданнямі, інтарэсамі, выгадай, але ён абавязаны рабіць так, як патрабуюць таго мараль, закон і этыка. У маім рамане «Вам заданне» мой герой менавіта так і робіць. Хоць і гіне ў сутычцы з бандытамі. І такія моманты прымушаюць пісьменніка думаць, а які ж бумеранг прыляціць ад яго твора? А ўсё таму, што ўсе дзеянні чалавека яму вяртаюцца. Гэта закон Сусвету: справядлівасць рана альбо позна перамагае. Піфагор казаў «Не мае значэння, што думаюць пра цябе іншыя. Дзейнічай па справядлівасці». І кожнаму з нас варта задумацца, што ёсць справядлівасць. Яна павінна спалучацца з такімі паняццямі, як праўда, гонар. Таму важна сваімі кнігамі тлумачыць чытачу сутнасць гэтых паняццяў, прымушаць задумвацца.

Падхапіў думку папярэдніх выступоўцаў і **расійскі пісьменнік, палітолаг Кірыл КОКТЫШ**. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што сённяшняя рэчаіснасць тоіць у сабе небяспеку, якой можа супрацьстаяць толькі чалавек адукаваны, які ўмее аналізаваць, думаць і размяжоўваць праўду і падман.

— Калі казаць пра сённяшнія выклікі і код справядлівасці, то мы апынуліся ў эпосе, калі стала магчымым кагнітыўнае праграмаванне. Праграмаванне чалавека, калі яму як канструктар-лега задаюцца нейкія мысленчыя канструкцыі, а пасля чалавек збярэ іх адзіным магчымым спосабам і пойдзе тым шляхам, які для яго ўжо пракладзены звонку. На самай справе тэхналогія гэтая, калі спрасціць, рэалізоўваецца праз сацыяльныя сеткі і іншымі інструментамі, яна даволі простая, і яе сутнасць — у аддзяленні эмоцый ад здольнасці думаць. Справа ў тым, што калі чалавек перажывае нейкія эмоцыі, то іх запас канечны. А потым, калі становіцца зразумела, што людзей падманулі і выдалі за праўду падман, то яны ўсё роўна ўжо страцілі эмоцыі і ў іх ужо склалася нейкае сваё меркаванне. І выходзячы з гэтай праўды, чалавек потым будзе ацэньваць усё астатняе, нават калі гэта будзе супярэчыць фактам. А другі кампанент, які дадалі, — гэта цяжкасць супастаўлення эмоцый з фактамі. Сучасны чалавек сёння менш запамінае. Ён давярае сваю памяць сецівy. І не ўсведамляе, што любая інфармацыя можа быць падменена за 10 хвілін. І, такім чынам, зменіцца калектыўная памяць. Чалавек пераўтвараецца ў слабавольны і нізкаінтэлектуальны прыдатак сецівa... Кніга — якраз той сродак, які дазваляе падумаць над інфармацыяй. І гэта такая «якарная» ўстаноўка, якая дазваляе зрабіць з яе процівагу любому адмоўнаму ўплыву. А калі казаць пра код справядлівасці, хоць мы і разумеем, што паняцце гэтае шматмернае, але ён нібы ўраўненне, якое нам пастаянна, штодзённа трэба рашаць. І гэта якраз і ёсць задача пісьменнікаў — здолець вывесці баланс вельмі складанага сацыяльнага ўраўнення...

Адзначылі выступоўцы таксама такую з'яву, як барацьба паміж высокай і камерцыйнай літаратурай. Чытачы ў большасці аддаюць перавагу апошняй. І некаторыя не толькі выказвалі сваё меркаванне, якой павінна быць годная літаратура для маладога пакалення, але і прапанавалі творы аўтараў, якіх таксама можна ўключыць у спіс-рэкамендацыю для кожнага чалавека. У прыватнасці, пісьменнік Усевалад Непагодзін адзначыў, што класічныя творы заўсёды даюць нам аналогіі падзей, якія паўтараюцца ў гісторыі. І, чытаючы іх, мы маем магчымасць параўноўваць, бачыць карціну ва ўсёй паўнаце:

— Што датычыцца вечных каштоўнасцяў, якія трансліруюцца праз кнігі, то я туды дадаў бы імкненне змяняць свет да лепшага. Таму што мы жывём у кліпавую эпоху, калі існуе шмат кліпавага кантэнту, і кнігам часам складана з ім канкурыраваць. Аднак, на мой погляд, калі ўзяць рускую класіку, то ў спіс яе твораў я дадаў бы кнігі Андрэя Платонава. Ты чытаеш яго кнігу «Шчаслівая Масква», і табе хочацца змяняць свет. Лічу, вельмі важна, каб была ў кнізе, у літаратуры матывацыя да стварэння.

Алена ДРАПКО.
Фота Кастуся ДРОБАВА.

Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ:

«У КОЖНАГА СВОЙ ШЛЯХ ДА АЧЫШЧЭННЯ»

Скажам шчыра: для гутаркі з гэтым творцам, які добра вядомы беларускаму чытачу, існавала не адна, а адразу некалькі падстаў. Так, у кастрычніку 2021 года вядомаму пісьменніку, аўтару 35 кніг прозы і публіцыстыкі было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь». А летам ужо бягучага года выбітны літаратар стаў першым этнічным беларусам, які ўганараваны Усерасійскай літаратурнай прэміяй імя Ф. І. Цютчава «Рускі шлях». Толькі што прыйшла яшчэ адна добрая вестка з суседняй краіны: наш творца стаў лаўрэатам расійскага аўтарскага конкурсу «Я пішу» Бранскай абласной навуковай універсальнай бібліятэкі, па выніках якога суседзі выдалі яго кнігу аповесцяў у перакладзе на рускую мову «Не сварыся з нябёсамі». І, нарэшце, 30 жніўня ганароваму члену Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшыні Гомельскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», сакратару Міжнароднага саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтва па Рэспубліцы Беларусь Уладзіміру ГАЎРЫЛОВІЧУ споўніцца 55 гадоў. Пра лёсавызначальныя вехі ў жыцці мы з ім і пагутарылі.

— Уладзімір Мікалаевіч, з нагоды юбілею і творчых перамог прымайце цёплыя віншаванні і ад калектыву «Звязды». Шчасця вам, плёну ва ўсіх літаратурных і жыццёвых справах!

— Дзякуй вялікі. Прыемна пачуць віншаванні ад найстарэйшай беларускай газеты, дзякуючы падтрымцы якой, дарэчы, і я, пачатковец з палескай глыбінкі, шукаў дарогі да шырокага чытача... Амаль трыццаць гадоў таму двойчы я стаў адным з пераможцаў рэспубліканскага конкурсу апавяданняў, арганізаванага «Звяздой». Памятаю да дробязяў першую сустрэчу з вядомым беларускім пісьменнікам Уладзімірам Саламахам, які — цяпер цяжка нават уявіць! — спецыяльна прыехаў на Палессе, прачытаў мае празаічныя спробы і зазначыў: «Хлопча, дык ты ж — пісьменнік!» (а пасля нават адрэдагаваў маю першую кнігу!). Гэта ж самае пасля першых публікацый у «Чырвонай Змене», «Звяздзе» і «Маладосці» ў сваім лісце да мяне сцвердзіў і яшчэ адзін аўтарытэтны майстар слова Віктар Гардзей. Для мяне іх парады былі «глытком свежага паветра» і штуршком да далейшай працы: не пакідаць літаратурнай справы, нягледзячы ні на што, працаваць яшчэ больш, сур'ёзна і адказна ставіцца да кожнага слова. Дарэчы, Уладзімір Пятровіч з тае пары — не проста найстарэйшы сябра — ён назаўжды мой літаратурны настаўнік, якому я першаму давяраю свае новыя творы...

— Што для вас «дух Палесся», адметнасць Палесся, яго жыхароў?

— На Палессі ўсё асабліва... І прырода адметная, і людзі. Раней як было: цяжка не цяжка, малы не малы, бяры коску ды на балота! Працуй! Заціскі народ у працы. Які мала спадзяецца на нечую падтрымку з боку. Ніколі не спадзяецца на лёгкі хлеб. Я яго, дарэчы, ніколі лёгкага там не бачыў. Усё з мазаля. Памятаю талаку: збіраліся суседзі, родзічы і па чарзе садзілі адзін аднаму агароды, па чарзе, калі ўмярзалася балота, звозілі зімой сена з балота Высокі Рог... І ў кожнай гаспадарцы рыхтаваліся да гэтага асабліва, самае лепшае на стол. Ды паўсюль гучалі песні. Божа, гэта было так шчыра, так прыгожа. З якой павагай адзін да аднаго людзі ставіліся! Што б ні рабілі — паўсюль былі чуваць песні. Мабыць, таму на маёй Жыткаўшчыне і дагэтуль больш чым сорак народных песенных калектываў — нідзе ў вобласці такой колькасці няма. Але за некалькі дзясяткаў гадоў жыццё тут карэнным чынам змянілася, і песень ужо стала меней. А шкада, што мы страцілі культуру папярэднікаў. Амаль страцілі... большую яе частку.

«Раней як было: цяжка не цяжка, малы не малы, бяры коску ды на балота! Працуй! Заціскі народ у працы. Які мала спадзяецца на нечую падтрымку з боку. Ніколі не спадзяецца на лёгкі хлеб».

— Ці можаце ўспомніць такі момант у дзяцінстве, юнацтве, калі яскрава адчулі сваю далучанасць да роду, повязь пакаленняў, гістарычную памяць?

— Гэта быў не адзін момант... Штогод на Каляды ў дзедавай хаце было вялікае свята: прыязджаў з Калінкавіцкага раёна дзедаў малодшы брат, Канстанцін Адамавіч Буякевіч. Я малы, але ведаў: ён — кадравы афіцэр у адстаўцы, дырэктар Ліпаўскай школы. Я па просьбе дзеда Ігната яму пісаў пісьмы... А на Яблычны Спас дзед Ігнат збіраўся да брата, часам браў у госці і мяне. Я чуў іх размовы: пра вайну, пра род, пра спаленых і загінулых родзічаў. Яны — гаротнікі — плакалі, сумавалі і радаваліся кожнай сустрэчы, а іх дзеці, унукі і праўнукі — галінкі роду, жорстка абкарнанага на 90 працэнтаў фашысцкімі і паліцэйскімі нелюдзямі ў вайну. Уявіць нават немагчыма: якімі б моцнымі карані былі сёння ў майго роду Буякевічаў—Мірановічаў—Гаўрыловічаў. Можа, таму на генетычным узроўні я так ненавіджу фашызм?! І гэтая тэма пастаянна — патрыятызму і вернасці радзіме — прысутнічае ў маёй творчасці? Можа, таму я не супакоіўся, пакуль, дзякуючы расійскім пошукавікам, не знайшоў шэсць гадоў таму пад Ржэвам магілу свайго другога дзеда, бацькавага бацькі — Васіля Ігнатавіча Гаўрыловіча? Ды, мабыць, ужо не супакоюся: буду пісаць пра тое гераічнае пакаленне, што б мне ні казалі: маўляў, ты не жыў і не бачыў. Але адчуваю, што мне перадалася памяць загінулага майго рода, дзеда Васіля: ён загінуў, абараняючы вёску Добрая 30 жніўня 1942 года, а я нарадзіўся 30 жніўня 1967-га, роўна праз чвэрць стагоддзя, дзень у дзень...

— Цікава, сапраўды... Вы шмат гадоў займаецеся журналістыкай... На вашу думку, журналістыка і літаратурная творчасць тоесныя ці, наадварот, вельмі розныя? У чым журналістыка можа дапамагчы літаратару, у чым перашкодзіць?

— Журналістыка — проза аднаго дня — і дапамагае, і шкодзіць адначасова. Мне яна дапамагала заўсёды ў адным: незвычайнымі сустрэчамі з цікавымі людзьмі. Асабліва намнога за мяне старэйшымі, якія прайшлі праз немагчымыя выпрабаванні. Сама атмасфера такіх сустрэч пакідала зарубкі ў памяці назаўжды. І калі прыходзіць час напісання мастацкага твора, усё «назапашанае» звычайна ўсплывае перад табой, і ты яго бачыш, суадносіш з рэальным чалавекам, якога ведаеш. Таму шмат плюсоў. А кепска тое, што журналістыка дагэтуль у мяне забірала самую большую частку рабочага часу, што не спрыяе прозе.

— Распавядзіце пра сваю п'есу «Маленькая каралева Еўдакія Тураўская». Як узнікла задума, якім быў лёс твора. Як складваюцца вашы адносіны з тэатрам?

— Мне дагэтуль здаецца, што я гэты драматычны твор не прыдумаў, а прысніў... Так, сваіх герояў я бачыў у сне. І не раз. Але на самай справе, з'яўленню гістарычнай драмы-версіі папярэднічала рэальная сітуацыя, якой я быў сведкам. У 2005 годзе над астанкамі храма XII стагоддзя ў Тураве была ўзведзена музейная крыпта. Пры раскопках, якія вяліся адначасова з будаўніцтвам, нічога адметнага знойдзена не было, хіба што некалькі саркафагаў, у адным з якіх — маладая дзяўчына, гадоў сямнаццаці-дзевятнаццаці... Першая думка, якая наведала маю грэшную галаву, калі пабачыў косці, што праляжалі больш васьмі стагоддзяў, — гэта не хто іншы, як дачка князя Ізяслава (аднаго з шасцярых сыноў Яраслава Мудрага) і яго жонкі Алісавы ці Лізаветы (або Гертруды, польскай каралеўны, сястры польскага караля Казіміра I). Ізяславу ж дастаўся старажытны, таямнічы Тураў якраз па яго паўналецці — гэта быў самы непакорны з гарадоў-васалаў кіеўскага князя... Мае ж думкі пра іх адзіную дачку, а больш чым стагоддзе ў тураўскіх князёў не было дачок, адны сыны, сталі сягаць далей і далей, пакуль не нарадзілася гэтая п'еса пра час і пра каханне. У нейкай ступені, магчыма, яна нагадвае шэкспіраўскае прачытанне на новы лад, але твор мае права на жыццё. Канешне, як і ў любым мастацкім творы, тут шмат прыдуманага, але я стараўся прытрымлівацца гістарычнай праўды, што хоць крыху дайшла да нас. Хаця ж пра якую праўду можна казаць праз стагоддзі?!

Што да тэатральнага ўвасаблення, то тут з майго боку нават спроб «прабіць» пастаноўку я не рабіў абсалютна ніякіх. Хаця ж пасля публікацыі ў аўтарскім зборніку п'есу паставілі некаторыя народныя калектывы, і яна дагэтуль яшчэ чакае прафесійнай сцэны.

— Не кожны пісьменнік любіць публічныя выступленні... Як вы ставіцеся да такіх мерапрыемстваў, наколькі для вас важная зваротная сувязь?

— Няма пісьменніка, які б раўнадушна ставіўся да таго, як прыняў чытач яго новы твор. Я такі ж. Зваротная сувязь павінна быць. І ў мяне яна ёсць. Ёсць і мой чытач. Інакш не прысылалі б мне звычайныя лісты па пошце, што сёння можа паказацца нават дзіўным, але такія пісьмы я атрымліваю. Праз электронныя носьбіты таксама прысылаюць водгукі-ўражанні. Гучаць яны і на творчых сустрэчах. Часта бывае і так, калі кажуць: так ці падобна было і з маім родзічам, скажыце, а вы не пра яго лёс пісалі? Іншая справа, што публічныя выступленні — гэта вельмі адказная і цяжкая справа, і не кожны з творцаў можа іх правесці цікава, запамінальна. Да кожнай сустрэчы трэба рыхтавацца, разумеючы, што да твайго слова ўсё ж прыслухоўваюцца. А першае выступленне... Відаць, яно было ў Жыткавічах, у раённым Доме культуры, на прэзентацыі першай кнігі прозы і публіцыстыкі «Сподніе яблыкі» — тады да невядомага краіне пачаткоўца, які падае нейкія надзеі, прыехалі вядомыя аўтары Алесь Карлюкевіч і Навум Гальпяровіч...

«Калі прыходзіць час напісання мастацкага твора, усё «назапашанае» звычайна ўсплывае перад табой, і ты яго бачыш, суадносіш з рэальным чалавекам, якога ведаеш».

— Ці перачытваеце ўласныя творы? З якім адчуваннем?

— Часам перачытваю. Бывае: рука цягнецца нешта перапісаць. Але разумееш, што гэта няправільна: напісанае чвэрць стагоддзя таму нельга перарабляць, бо ты, аўтар, быў іншы, у іншых грамадскіх умовах, у той адмежак часу ты жыў іншымі эмоцыямі і надзеямі, іншымі вачыма глядзеў на жыццё. Не, перапісваць не буду.

«Так, сваіх герояў я бачыў у сне. І не раз. Але на самай справе, з'яўленню гістарычнай драмы-версіі папярэднічала рэальная сітуацыя, якой я быў сведкам».

— Традыцыйнае пытанне — над чым працуеце зараз?

— Толькі што завершаны новы гісторыка-пазнавальны, сацыяльна-праблематычны раман-версія «Па веры вашай...». Падзеі твора адбываюцца ў нашы дні, у 2020 і 2021 гадах, а таксама дзесяць стагоддзяў таму ў старажытных Тураве, Кіеве і Кракаве. Твор цяжкі і няпросты, пісаўся ў пандэмію. Ён пра мяне і пра вас, пра нас, якія мы ёсць, пра род, пра сям'ю, пра краіну, у якой жылі і жывём, пра мінулае і сучаснасць. Я перакананы: памяць канчаткова не сціраецца нават праз вякі. Несучы па жыцці свой духоўны крыж, усе героі мастацкага твора праходзяць цяжкі шлях да ачышчэння. Яны абараняюць веру сваю, род і сям'ю, гістарычную памяць сваёй шматпакутнай зямлі. Раздзелы з рамана апублікаваў часопіс «Полымя», асобнікам ён толькі што выйшаў у РВУ «Звязда». А на рабочым стале ўжо нараджаецца працяг гэтага твора...

Падрыхтавала Людміла ІВАНОВА.

«Жанчыны — за ўраджай»

У межах акцыі пад такой назвай дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ірына ПАЛЯКОВА і раённы камітэт прафсаюза работнікаў АПК віншавалі жанчын Віцебскага раёна, дзякуючы рукам якіх атрымана значная доля агульнага караваю-2022.

Віцебская вобласць урачыста перасягнула мільённы намалот. Для паўночнага рэгіёна, які заўсёды лічыўся зонай рызыкі для земляробства, гэта своеасаблівы рэкорд, які віцебскія хлебаробы ўстанавілі трэці раз: мільённая мяжа была дасягнута ў 1976 і 2014 гадах. На сёння ў вобласці засталося ўбраць менш за пяць працэнтаў плошчаў, таму вынік будзе яшчэ большы. Што стаіць за дасягненнямі кожнай гаспадаркі, якія рупліва фарміруюць каравай краіны? Адказ адназначны: людзі. Апантаныя сваёй справай прафесіяналы-хлебаробы, якія цалкам усведамляюць важнасць укладу кожнага ва ўборачную кампанію.

Акцыя «Жанчыны — за ўраджай», якую дэпутат ніжняй палаты парламента сумесна з галіновым прафсаюзам праводзіць у Віцебскай, Гарадоцкай і Шумілінскай выбарчых акругах, накіравана на жанчын, якія шмат гадоў прысвяцілі сельскай гаспадарцы. Вагаўшчыцы, загадчыцы зернесушыльных комплексаў і сталовых, аграномы — сярод гэтых прафесій не прынята падводзіць вынікі, але іх уклад у развіццё краіны важкі. Нашы моцныя прадстаўніцы прыгожага полу не лічаць свае прафесійныя дасягненні подзвігамі, але словы падзякі за, здавалася б, нябачную працу расчульваюць кожную.

26 гадоў натхнення

Хтосьці шчыруе на залатых нівах ад відна да відна, а хтосьці — сярод шэрагу бурлівых рондаляў у сталовых, забяспечваючы механізатарам гарачае харчаванне на працоўных месцах. Адна з такіх «байцоў нябачнага фронту» — **загадчыца сталовай СУП «Ліпаўцы» Таццяна ЧАРНУХА.**

Загадчыца сталовай СУП «Ліпаўцы» Таццяна ЧАРНУХА.

Акрамя традыцыйных страў, з-пад яе лёгкай рукі абавязкова кожны дзень выходзяць духмяныя булачкі, якія вельмі даспадобы аграрыям. Гэта «разыначка» мясцовай сталовай робіць яе адметнай ва ўсім раёне — чакаюць вадзіцелі, механізатары, пастухі, работнікі зернесушыльнага комплексу часцінку душэўнага хатняга смаку, якога так не хапае ў гарачыя дні жніва. Штодзень Таццяна разам з памочніцамі гатуе каля 150 абедаў і 50 вячэр. Двухразовае харчаванне ў «Ліпаўцах» гарачае, для ўсіх удзельнікаў палявых работ бясплатнае — гэта адзінае прадпрыемства ў раёне, якое стварыла для працаўнікоў такія ўмовы. На кухні шчыруюць утраіх — Таццяна выконвае абавязкі і загадчыцы, і кухара, дзве памочніцы развозяць абеды.

«Гатуем смачна, як дома. Ахвотна прымаем заказы з палёў — і дзеруноў мужчынам хочацца, і лянівых галубцоў. Яшчэ ў спякоту даспадобы працаўнікам халодныя супы, дамашнія саленні — адмысловыя агуркі і памідоры. Адным словам, падтрымліваем як можам, каб у камбайнераў пасля цяжкага дня за штурвалам былі сілы яшчэ зрабіць некалькі кругоў па хлебнай ніве», — усміхаецца Таццяна.

На пытанне, у чым заключаецца сакрэт нястомнасці, загадчыца адказвае, што ў добрым настроі, які, як правіла, з'яўляецца найлепшай спецыяй. А яшчэ — адданасць абранай прафесіі і поўная адказнасць за сваю справу. З 7 гадзін раніцы і да 5 вечара кожны, хто прыйдзе ў сталовую, не павінен застацца галодны. Так, дарэчы, ніколі і не здараецца, нават нас у 9 раніцы жанчына ветліва сустракала са свежым печывам.

Сталовая стала для Таццяны месцам прафесійнага станаўлення і вытворчых поспехаў. Сюды яна прыйшла адразу пасля заканчэння Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа сельскагаспадарчай вытворчасці, і ўжо 26 гадоў не згасае запалены ў яе вачах агеньчык. Да графіка без выхадных вясковаму чалавеку не прывыкаць: днём — у сталовай, вечарам займаецца асабістай гаспадаркай, і на ўсё хапае часу гэтай далікатнай, але зусім не слабай жанчыне. Муж працуе ў лясгасе, а па нялёгкай сцяжынцы сельскай гаспадаркі разам за маці пайшла дачка Дзіяна — яна працуе пасля Горацкай акадэміі эканамістам у «Ліпаўцах», а сын ідзе ў сёмы клас. Гэтая гармонія — сямейная і прафесійная — дае Таццяне сілы і натхненне на новыя поспехі, якія не застаюцца неадзначанымі.

«Дзякуючы вашай шматгадовай і плённай працы, надзейнасці і самаадданасці фарміруецца моцны падмурак харчовай бяспекі нашай краіны. Ад вас залежыць сапраўды вельмі шмат», — павіншавала жанчыну Ірына Палякова.

Педагогіка хлебнага золата

У гарачыя дні жніва з нязменнай ветлівай усмешкай сустракае вадзіцеляў Віцебскай бройлернай

Людміла БАРАНАВА і Святлана АНІСІМАВА ўдваіх працуюць у сталовай «Вымна» УТП «Руакова» ўжо шосты год.

птушкафабрыкі на вагах вытворчага ўчастка «Курына» **Валянціна ЯЗЭПЕНКА**. Былая настаўніца беларускай мовы і літаратуры зараз лёгка ўпраўляецца з матэматычнымі падлікамі — яе стаж работы на зернесушыльным комплексе 13 гадоў. Як здарылася, што жанчына змяніла сшыткі і журналы на горы золата палёў? Адказ просты: прымусілі аптымізм і незгасальная энергія.

Вагаўшчыца вытворчага ўчастка «Курына» Валянціна ЯЗЭПЕНКА.

Гамяльчанку Валянціну прывялі ў Віцебскі раён жыццёвыя абставіны, а яна павярнула вірлівы ручай лёсу ў свае рэчышча. У 1990 годзе прыйшла працаваць у Курынскую школу настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Адказны падыход маладога педагога да навучальнага працэсу і поспехі на адукацыйнай ніве не засталіся незаўважанымі — з 1997 да 2010 года яна займала пасаду завуча ў гэтай жа ўстанове. Прыйшоў час выходзіць на пенсію, а працоўны патэнцыял так і не быў скарыстаны, ды і сядзець без спраў на заслужаным адпачынку не хацелася.

Лес звёў Валянціну Іванаўну з сельскай гаспадаркай, на пенсіі працавала ў Курыне загадчыцай склада, а пасля — калі ў комплексе пабудавалі тры сушылкі і перапрафілявалі пад камбікармавую вытворчасць — перавялася на пасаду вагаўшчыцы, на якой працуе пятае жніво. Усяго за плячыма жанчыны 13 уборачных сезонаў, тысячы «адпушчаных» машын і дзясяткі тысяч тон збожжа. Штодзень яна запаўняе рэестры, вядзе вялікую дакументацыю (адну машыну неабходна апісаць 8 разоў!) і, атрымліваецца, вызначае перадавікоў на жніве і адвозцы. За, здавалася б, звычайнай справай стаяць вытворчыя вынікі кожнага механізатара і цэлага прадпрыемства.

Тут, у Курыне, яна знайшла сямейнае шчасце, нарадзіла дачку Марыну, а тая падарыла маці дваіх унукаў — Ульяну і Мацвея. Падчас нашай размовы вызначылася, што любоў да зямлі ў сям'і Язэпенкаў у крыві — старэйшы сын Ігар працаваў аграномам у агракомплексе «Адраджэнне»; муж — аграномам і старшынёй калгаса ў Курыне; зяць, скончыўшы агранамічны факультэт Горацкай акадэміі, таксама пачынаў пісаць працоўны летапіс у гэтай гаспадарцы.

Адшчыраваўшы днём на вытворчым участку, вечарам Валянціна Іванаўна спяшаецца дадому, дзе на дварэ рохкаюць парсючкі і квохчуць куры. І на ўсё гэтай нястомнай жанчыне хапае запалу, яна нават паспявае актыўнічаць на пасадзе старэйшыны вёскі! Але, прызнаецца, цяжкі графік з паловы восьмай раніцы і амаль да 11 вечара апошнім часам адчуваецца цяжэй — гады бяруць сваё.

«Праца ў галіне сельскай гаспадаркі ніколі не была лёгкай, вы з гонарам на працягу 13 гадоў стаіце ў страі. Гэта паказчык шчырай любові да прафесіі, нягледзячы на цяжкія выпрабаванні жнівом. Вытворчыя поспехі ўсяго прадпрыемства — гэта і ваша заслуга», — адзначыла прафсаюзны лідар аграрыяў раёна Таццяна Дзіканава.

Кулінарны вымнянскі дуэт

Па адрасе акцыі «Жанчыны за ўраджай» зноў сталовая. І зноў незвычайная, бо тут не проста гатуюць стравы з меню ў адпаведнасці з тэхналагічнай картай, а ўкладваюць у іх душу і добры настрой. Размова пра кулінарны дуэт **Людмілы БАРАНАВАЙ** і **Святланы АНІСІМАВАЙ**, якія ўдваіх працуюць у сталовай «Вымна» УТП «Руакова» ўжо шосты год. Кухня стала для жанчын месцам прафесійнага станаўлення і сяброўства, якое ператварылася ў штосьці большае, чым адносіны калег.

Людмілу ў Вымнянскі край, які ў раёне лічаць калыскай таямніц, прывяло каханне. Зараз яна выконвае абавязкі кухара, але шэсць гадоў таму прыйшла ў сталовую з ужо вялікім багажом вопыту — працавала адміністратарам і кухарам у мясцовай аграсядзібе «Малінкі». Тады, расказвае жанчына, даводзілася прымаць замежныя дэлегацыі, было дзе разгарнуцца фантазіі — на стол падавалі запечаныя бабрыныя хвасты, адбіўныя з ласяціны, адмысловыя стравы з дзічыны. А пасля таленавітую кулінарку запрасілі на работу ў сталовую, дзе, вядома, далікатэсаў не гатуюць, але імкнуцца рабіць смачна і па-дамашняму.

Святлана прыехала ў Вымна з Расіі 20 гадоў таму. Дзеці — хлопчык і дзяўчынка — вучацца ў мясцовай школе, дзе калісьці працавала і сама жанчына. Пасля пераходу ў сталовую, якая ў пару жніва выконвае адну з найважнейшых функцый, набыла яшчэ адзін сур'ёзны абавязак — смачна карміць мужа. Ды не дома, а ў полі! Муж Святланы Васільеўны працуе памочнікам камбайнера ў гэтай жа гаспадарцы, таму якасць і смак прыгатаваных страў для аграрыяў у яе на асабістым, сямейным кантролі.

З красавіка і, лічы, да лістапада родныя амаль не бачаць жанчын дома. З самага пачатку вясенніх палявых работ і да заканчэння асенняй сяўбы сталовая працуе няспынна, яны ўдваіх шчыруюць без выхадных, але гэта іх не пужае — рупліва, як пчолы, Людміла і Святлана складаюць меню, аператыўна гатуюць і развозяць абеды па палях. Кожны дзень аграрыяў частуюць новенькім — баршчы і расольнікі, смажаная курыца і катлеты, пюрэ і розныя гарніры. А яшчэ — дамашнімі кампотамі з натуральнай садавіны і сваімі саленнямі. А палове шостай раніцы па кухні ўжо пачынаюць расплывацца пахі кулінарных вынаходніцтваў, і толькі каля трох гадзін дня Святлана і Людміла могуць уздыхнуць з палёгкай. Абеды развозяць па чарзе: адна застаецца «дзяжурыць» на кухні, а другая едзе да працаўнікоў, за дзень даводзіцца намотваць звыш 100 кіламетраў. А пасля — да асабістай гаспадаркі: каровы, парсюкоў, кур.

Поспех іх кулінарнага дуэта, лічаць жанчыны, заключаецца ў даверы і ўзаемапавазе. За столькі гадоў яны навучыліся разумець адна адну не толькі з паўслова, але і нават з позірку, а іх супрацоўніцтва даўно выйшла з-за сцен сталовай, ператварыўшыся ў моцнае сяброўства. Людміла і Святлана разам адзначаюць святы, змагаюцца з няўдачамі і радуюцца дасягненням. І наперакор вядомай песні цвёрда ўпэўненыя, што жаночае сяброўства існуе.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

Чулі?

Пазбегнуць бяды

22 верасня пройдзе Адзіны дзень бяспекі

Напярэдадні дня намаганні арганізатараў будуць накіраваны на фарміраванне ў грамадстве культуры бяспекі жыццядзейнасці, правядзенне адукацыйна-выхаваўчай работы і прапаганду бяспечных умоў пражывання насельніцтва, паведаміла Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

«За гэты час пройдзе мноства навучальных прафілактычных мерапрыемстваў па папярэджанні надзвычайных сітуацый, правапарушэнняў і злачынстваў і навучанні правілам паводзін ва ўмовах розных надзвычайных сітуацый. Інфармацыйныя матэрыялы да Адзінага дня бяспекі будуць шырока трансліравацца ў СМІ, на інтэрнэт-рэсурсах і ў месцах масавага знаходжання людзей», — расказалі ў ведамстве.

Галоўнымі арганізатарамі акцыі выступаюць органы дзяржаўнага кіравання і суб'екты прафілактыкі правапарушэнняў. Таксама да іх далучацца грамадскія аб'яднанні, сродкі масавай інфармацыі і іншыя зацікаўленыя арганізацыі.

Центр Промышленной Оценки • ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ • ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**Унитарное предприятие «Калинковичский молочный комбинат», Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Суркова, 10**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Месторасположение:
Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Коммунальная, 87 и Петриковский р-н, севернее города Петрикова

Производственная база в составе: **мойка транспорта** (335/С-102896, общ. пл. 92,5 кв. м), **здание котельной, одноэтажное, кирпичное** (335/С-6633, общ. пл. 380,2 кв. м, составные части: две пристройки), **здание цеха, одноэтажное, кирпичное** (335/С-6629, общ. пл. 2 125,7 кв. м, составные части: шесть пристроек), **здание склада – ангара, одноэтажное, кирпично-металлическое с тремя нежилыми изолированными помещениями** (335/С-6628, общ. пл. 523,9 кв. м), **здание компрессорной, одноэтажное, кирпичное** (335/С-6634, общ. пл. 301,2 кв. м, составные части: пристройка), **здание конторы, одноэтажное, кирпичное, окрашенное** (335/С-6631, общ. пл. 347,2 кв. м, составные части: терраса), **проходная** (335/С-102936, общ. пл. 9,5 кв. м), **здание КНС, одноэтажное, кирпичное** (335/С-6630, общ. пл. 12,2 кв. м), **трансформаторная подстанция** (335/С-102897, общ. пл. 42,6 кв. м, составные части: трансформаторная подстанция), **асфальтовая дорога к навесу с дезбарьером** (335/С-102916, общ. пл. 187,0 кв. м, составные части: асфальтовая дорога к навесу с дезбарьером), **отстойник** (335/С-102919, общ. пл. 27 955,9 кв. м, составные части: отстойник), **отстойник 2-ярусный** (335/С-102920, общ. пл. 40,0 кв. м, составные части: отстойник 2-ярусный), **навес с дезбарьером** (335/С-102900, составные части: навес с дезбарьером), **забор кирпичный** (335/С-102898, составные части: забор кирпичный), **забор железобетонный** (335/С-102917, составные части: забор железобетонный), **забор железобетонный** (335/С-102918, общ. пл. 1075,0 кв. м, составные части: забор железобетонный), **автодороги внутризаводские** (335/С-102899, общ. пл. 5 449,5 кв. м, составные части: автодороги заводский), **трубопровод из труб из полимерных материалов** (335/С-789604, общ. пл. 220,3 кв. м, составные части: А-трубопровод из труб из полимерных материалов), **тепловые сети** (335/С-789602, общ. пл. 18,9, составные части: П-тепловые сети), **кабель подземный** (335/С-78960, составные части: Т-кабель подземный), **напорная канализация** (335/С-70936, составные части: трубопровод напорный, протяженность 108 м, трубопровод напорный, протяженность 282 м, трубопровод напорный, протяженность 80 м), **сеть канализационная** (335/С-789603, общ. пл. 247,0 кв. м, составные части: С-сеть канализационная), **сеть водопроводная** (335/С-789605, общ. пл. 21,0 кв. м, составные части: Р-сеть водопроводная), **гараж** (335/С-789639, общ. пл. 208,0 кв. м), **склад ГСМ** (335/С-789635, общ. пл. 31,1 кв. м), **склад металлический** (335/С-789637, общ. пл. 17,2 кв. м), **склад металлический** (335/С-789636, общ. пл. 17,2 кв. м), **здание мазутонасосной, одноэтажное, кирпично-металическое** (335/С-6632, общ. пл. 48,8 кв. м), **скважина артезианская** (335/С-789634, общ. пл. 20,3 кв. м), **скважина артезианская** (335/С-789638, общ. пл. 19,7 кв. м), **труба дымовая кирпичная** (335/С-789632, общ. пл. 11,0 кв. м), **труба дымовая металлическая** (335/С-789633, общ. пл. 1,0 кв. м), **резервуар пожарный** (335/С-789628), **башня водонапорная** (335/С-789629, общ. пл. 13,0 кв. м), **емкость для хранения топлива** (335/С-789630, общ. пл. 28,0 кв. м), **емкость для хранения топлива** (335/С-789631, общ. пл. 28,0 кв. м)

Сведения о земельном участке 1: предоставлен продавцу для содержания и обслуживания зданий и сооружений завода на праве постоянного пользования пл. **2,6614 га.**
Сведения о земельном участке 2: предоставлен продавцу для содержания и обслуживания очистных сооружений (для размещения объектов коммунального хозяйства) на праве постоянного пользования пл. **4,3024 га**

В состав лота входит иное имущество, перечень которого размещен на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by

Начальная цена лота с НДС 20 % – 245 701,54 бел. руб. (снижена на 90 %)
Шаг аукциона – 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с (BYN) BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: 100 процентов от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение **5 (пяти) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 12.08.2022 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**с 11.00 до 13.00 14.09.2022 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.09.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**
Контактные данные	**Тел.: +375 17 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки • ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ • ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский, с/с 19**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов: капитальное строение, расположенное по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25

Наименование	Начальная цена с НДС 20 %
Здание склада (здание нежилое), инв. номер: 620/С-15616, общей площадью 7601,4 кв. м. Составные части и принадлежности: целое двухэтажное панельное здание склада РТИ и химической продукции (В2/п) **Дополнительная информация:** ипотека, аренда (2 976,72 кв. м)	**2 448 466,80** бел. руб.

Сведения о земельном участке с кадастровым номером 622250600001002167: предоставлен на праве аренды по 15.12.2120 для строительства и обслуживания склада общей площадью 1,6881 га

Предмет электронных торгов: оборудование, реализуемое одним лотом, по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19

Наименование	Начальная цена с НДС 20 %
Экструзионная линия, модель FCL 21/SH PROCAST, для производства стреч-пленки (экструдер в сборе) Dolce, 2004 г. в., инв. номер нф00028	**3 092 160,00** бел. руб.
Холодильное оборудование № 1, Dolce, 2015 г., инв. номер нф00027	

Сведения о земельном участке пл. 0,4768: предоставлен на праве аренды по 23.08.2120 для строительства и обслуживания насосной

Задаток 5 % от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 90 календарных дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 04.10.2022.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 03.10.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **Хойникское районное потребительское общество** (УНП 400056838), 247618, Гомельская обл., г. Хойники, ул. Жукова, д. 3 в лице ликвидатора Беланова Руслана Николаевича, тел. +375 (29) 690-00-10.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **21 сентября 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	**Грузовой автомобиль МАЗ 437043 2009 года выпуска, рег. знак АЕ 0466-3, идентификационный номер (номер кузова, рамы) Y3M43704390000770, инв. № 122**	5050,00

Местонахождение: Гомельская обл., г. Хойники, Жукова, 3. Телефон для ознакомления и осмотра +375 (29) 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 05.09.2022 г. 09.00 по 20.09.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 22.07.2022 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 26 сентября 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
«Технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники» с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения)
Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212
Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17
Начальная цена – 583 040,40 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка – 58 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **26 сентября 2022 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 06.09.2022 по 22.09.2022 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль» объявляет о проведении аукциона по продаже имущества

Наименование	Кол-во (штук)	Цена аукциона с НДС	Сумма задатка (10 %)
Вентилятор центробежный В-4-75	5	1920,00	192
Вентилятор В-06-300	2	158,40	15,84
Камера орошения КТЦ-2-63	1	2280,00	228,00
Камера орошения КТУ-2-40	4	6240,00	624,00
Камера орошения КТУ-2-17,5	2	1680,00	168,00
Итого		**12 278,40**	**1227,84**

Имущество находится по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121.

Торги состоятся 3 октября 2022 года в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Горького, 121.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- копия платежного поручения о внесении на счет РУПП «Гроднотекстиль» № BY32BLBB30120500048503001001, БИК BLBBBY2X в ОАО «Белинвестбанк» г. Гродно, УНП 500048503, суммы задатка;
- копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица (индивидуального предпринимателя).

Документы должны быть представлены до 15.00 30 сентября 2022 года.

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат продавца по оценке и объявлению в газете. Условия оплаты по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Также покупатель производит демонтаж оборудования.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Телефон для справок 80298875279.

ГЛУША Адамовіча

«Звязда» працягвае публікаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча.

КНІГІ ПРА ГАЛОЎНАЕ

Творчасць Алеся Адамовіча не страчвае актуальнасці. Нездарма амаль адначасова ў Маскве і Мінску ў розных выдавецтвах перакладзены яго кнігі пра вайну. Знамянальна, што адбылося гэта напярэдадні 95-годдзя пісьменніка. Менавіта столькі б гадоў споўнілася сёння, 3 верасня, беларускаму пісьменніку, крытыку, літаратуразнаўцу, публіцысту, грамадскаму дзеячу, доктару філалагічных навук, прафесару, удзельніку Вялікай Айчыннай вайны Алесю Адамовічу. Разам з дачкой пісьменніка Наталляй Адамовіч гутарым пра кніжныя перавыданні і пра тое, як яны ствараліся.

АПЯРЭДЖВАЮЧЫ ЧАС

Зноў вяртаемся ў Глушу з яе вайной пад стрэхамі і сынамі, якія ідуць у бой. У мінскім выдавецтве выйшла дылогія «Партызаны», якая абагульніла два вядомыя раманы. Гэта, дарэчы, ужо другое выданне твораў (раней выходзіў том з аповесцямі «Віксі», «Хатынская аповесць», «Нямко», артыкуламі і лістамі) у папулярнай серыі «Беларускі кнігазбор». З рускай мовы, на якой пісаў свае мастацкія творы пісьменнік, тэкст пераклала таленавітая беларусазнаўца Ірына Шаўлякова. «Гэты твор — адзін з выдатных узораў беларускай ваеннай прозы. На беларускай мове друкуецца ўпершыню», — гаворыцца ў анатацыі. Кніга стала 109-й у знакамітай серыі!

У выпусках звяздоўскага праекта мы паспелі паразмаўляць, напэўна, з усімі нашчадкамі партызанаў з Глушы, якія жывуць у адамовіцкай дылогіі. Аматар дакладнай інфармацыі, Адамовіч прысвяціў сваёй малой радзіме літаратурны помнік, дзе кожны герой, дом, вуліца рэальна існуюць. Дакладней, існуюць у сваім ваенным часе. Зараз шмат чаго змянілася і кнігі сталі нечым накшталт правадніка. Па іх можна аднавіць выгляд даваеннага пасёлка і даведацца, хто там у асноўным жыў і нават чым дыхаў. Нехта здымае для гэтага кіно, Алесь Міхайлавіч прыпыніў імгненне на паперы. Адамовічу шчасціла з аднадумцамі. Яго раманы натхнілі Уладзіміра Высоцкага на напісанне найлепшых песень пра вайну, а знакамітага беларускага рэжысёра Віктара Турава — на стварэнне аднайменных фільмаў. Хоць за праўду ім прыйшлося яшчэ і пазмагацца.

— У віну аўтарам ставілі тое, што яны недастаткова поўна паказалі кіруючую ролю партыі ў фарміраванні партызанскага руху, — кажа дачка пісьменніка Наталля Адамовіч. — Гэтага сапраўды не было ні ў рамане таты, ні ў фільме... Яны паказвалі стыхійны народны рух, які зараджаўся сам, — на чалавечым і духоўным узроўні ў першыя гады вайны.

Дылогія стала прэлюдыяй да выкрывальных, жорсткіх у сваёй праўдзівасці кніг — «Я з вогненнай вёскі» і «Блакадная кніга», твораў, ад якіх і цяпер мароз па скуры. Гэта і ёсць тыя жахлівыя наступствы вайны, пра якія нават страшна казаць.

«Калі-небудзь маці не будуць разумець, як гэта дзеці нашы забівалі, а мы былі побач. Якія яны шчаслівыя, што ім гэта будзе незразумела», — гэта мары галоўнай гераіні дылогіі «Партызаны», якімі заканчваецца ваенная эпапея.

ЗВЯЗКА ГРАНАТ

Кнігу «Я з вогненнай вёскі», дзе Алесь Адамовіч, Янка Брыль і Уладзімір Калеснік запісалі расповеды больш чым трохсот сведак жахлівых падзей, сёння карысна перачытаць усім, хто лічыць, што генацыду беларускага народа не было. Яна пабачыла свет у маскоўскім выдавецтве «АСТ».

— Ідэя стварэння кнігі цалкам належыць тату, яна нарадзілася ў яго ў канцы 60-х, — кажа Наталля Адамовіч. — Ён вяртаўся з тых экспедыцый знясілены, бо ўсе яны ўтрох працавалі на сумленне. Гэта кніга — прысуд усім, хто здрадзіў чалавецтву. Аголены нерв, да якога нават праз дзесяцігоддзі страшна дакранацца.

Дачка пісьменніка ўспамінае, што, калі іх абаіх з Элемам Клімавым папракалі ў жорсткасці карціны «Ідзі і глядзі», Адамовіч адказваў, што яны не паказалі і паловы ўсёй праўды...

Пра тое, як нараджаўся гэты твор, а потым «Блакадная кніга», па сутнасці, можна напісаць яшчэ адну кнігу.

— У прадмове да расійскага выдання беларускі літаратуразнавец Сяргей Шапран расказвае пра работу пісьменнікаў, — удакладняе Наталля Адамовіч. — За два гады да смерці Брыля ён зрабіў з ім

інтэрв'ю, якраз да 30-годдзя выдання гэтай кнігі. Беларускі пісьменнік прыводзіць вельмі цікавыя факты з перыяду стварэння кнігі. Пра некаторыя я наогул не ведала.

У Наталлі захавалася некалькі фота перыяду стварэння кнігі. Вось яны ўтрох — Алесь Адамовіч, Янка Брыль і Уладзімір Калеснік — сядзяць каля старэнькага «Масквіча» Калесніка, на якім аб'ехалі ўсю Беларусь у пошуках суразмоўцаў. Наталля кажа, што ў кожнага былі свае абавязкі. Калеснік круціў баранку і адказваў за фота, Брыль і Адамовіч — за літаратурную частку. Магнітафон і плёнку ім выдавалі ў Радыёкамітэце. Працавалі спачатку паўнадпольна, іх запісы нават ім не належалі, бо плёнкі захоўваліся ў Радыёкамітэце і за іх адказвала іншая асоба. Прасцей стала працаваць, калі іх падтрымаў сакратар ЦК КПБ па ідэалогіі Аляксандр Кузьмін, былы ваенны лётчык. Запісы, якіх на той момант назбіралася на 72 (!) кіламетры плёнкі, былі зроблены ў двух экзэмплярах.

Дачку Алесь Адамовіч у сваю работу не ўводзіў. Надта жорсткай была тэма. Толькі з узростам, калі бацька ўжо пайшоў з жыцця, яна стала ўважліва вывучаць яго творчасць і зразумела, наколькі гэта каштоўна.

Дылогію «Партызаны» яна першапачаткова чытала, каб даведацца пра знаёмых з Глушы. Наталля там са стрыечнай сястрой Галінай усе канікулы праводзіла. З узростам прыйшло перасэнсаванне твора. Кнігу «Я з вогненнай вёскі» было страшна чытаць. Калі ты малады, хочацца зусім іншай інфармацыі.

— На той момант і адказныя асобы не ўсе разумелі, што гэтыя сведчанні абавязкова трэба захаваць, — кажа Наталля. — Некаторыя

райкамаўскія чыноўнікі палкі ў колы ставілі, імкнуліся не агучваць некаторыя факты. Вельмі баяліся агалоскі. Бо людзі сведчылі і пра тое, што згадваць некаторым не хацелася б. Вайна ж усё пакрывае. Бацька і яго спадарожнікі ведалі, наколькі вострыя ў іх матэрыял. Таму нават не ўсе злачынствы, пра якія ім расказвалі, апісвалі. Гэта праўда была цяжкая і для сваіх, і для чужых. У ГДР, напрыклад, кнігу адмовіліся друкаваць. Загадчык аддзела савецкай літаратуры выдавецтва «Volk und Welt» («Народ і свет») сказаў Брылю ў канфідэнцыяльнай размове: «І адна граната — гэта страшна. А вы падсоўваеце нам звязку гранат!»

ПАДАРОЖЖА З МІНСКА Ў МАСКВУ І НАЗАД

Папулярнасць Адамовіча ў Расіі расце. Летась выйшла «Чарнобыльская кніга» да 35-годдзя з дня аварыі. Зараз — «Я з вогненнай вёскі». Ужо рыхтуецца да выдання аповесць «Венера, або Як я быў прыгоннікам», якая ўбачыць свет на рускай мове ўпершыню. Ужо ёсць дамоўленасць з Наталляй Адамовіч на выданне апошняй кнігі пісьменніка — «Пражыта» («Віксі»), якую ён пісаў у прамым сэнсе слова пад кропельніцай. Гэта яго ўспаміны, пераасэнсаванне пражытага, споведзь перад усім светам. Не кожны яшчэ на такое адважыцца. Ёсць наогул малавядомы твор Адамовіча ў выглядзе дарожных запісак «Падарожжа з Мінска ў Маскву і назад». У пачатку 1960-х пісьменнік едзе ў Маскву, жыве і працуе там пэўны час. Затым вяртаецца ў Мінск і зноў едзе ў Маскву ўжо ў 1980-я. Гэта таксама амаль дзённікавыя запісы, лічы, споведзь перад усімі.

— Гэтыя «падарожжы» выходзілі толькі ў часопісе «Нёман» у 1994 годзе, праз паўгода пасля смерці таты ў 8 і 9 нумарах, — кажа Наталля. — Ён паспеў іх разам з «Віксі» занесці ў рэдакцыю. «Падарожжа з Мінска ў Маскву і назад» амаль ніхто не ведае. Там шмат вядомых прозвішчаў, якія трэба будзе яшчэ расшыфраваць. Я даўно мару яе выдаць, але ўвесь час прыходзілася адкладваць з-за іншых кніжак. Зараз гэты момант настаў.

ГОРКА

Непрыемная навіна прыйшла з Глушы. На сайце Бабруйскага райвыканкама з'явілася інфармацыя, што невядомыя пашкодзілі выяву пісьменніка на пункце прыпынку на ўездзе ў пасёлак. Напэўна, гэта былі выпадковыя людзі, якія дрэнна ведаюць родны край, яго гісторыю і тых, дзякуючы каму яна становіцца вядомая іншым. Валанцёры Бабруйскай раённай дзіцячай школы мастацтваў у рамках акцыі «Зробім наш горад прыгажэйшым» аднавілі партрэт пісьменніка.

Дарэчы, сёння, 3 верасня, у сельскім Доме культуры пасёлка Глуша ў 12.00 адбудзецца літаратурна-музычная кампазіцыя «Праўда жыцця Алеся Адамовіча», прымеркаваная да юбілейнай даты знакамітага пісьменніка.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Наталлі АДАМОВІЧ.

Нагадваем, што кожны можа ўнесці свой уклад у захаванне гістарычнай памяці нашай краіны. Бабруйскі райвыканкам (аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі) працягвае збор сродкаў на аднаўленне дома-аптэкі ў пасёлку Глуша пад музей Алеся Адамовіча. Роля яго ваенных твораў у захаванні праўды пра вайну неацэнная. На сайце ўнізе вы знойдзеце банер з рэквізітамі рахунка. Або можна скарыстацца нашай падказкай.

Р/р BY84AKBB36421292723267100000 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21703, УНП 701226324.

Прызначэнне плацяжу: «Для вырабу праектна-каштарысnай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў п. Глуша пад музей А. Адамовіча».

Створым музей разам! Падтрымаем добрую ініцыятыву!

СУЧАСНЫ ПАДРУЧНІК. ЗНАЧЭННЕ МАЕ ЎСЁ!

Якімі выданнямі парадуюць школьнікаў айчынныя выдавецтвы?

Не кожная краіна мае дастатковыя рэсурсы — інтэлектуальныя, матэрыяльныя, тэхнічныя, — каб нацыянальны падручнік быў дыхтоўны, прыгожы, добра ілюстраваны, у добрай вокладцы і з дастатковай перыядычнасцю перавыдаваўся — так, як гэта адбываецца ў Беларусі. Такую думку выказала на сустрэчы з журналістамі намеснік дырэктара Нацыянальнага інстытута адукацыі па метадычнай рабоце Людміла РАМАНОЎСКАЯ.

ШЛЯХІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ

— Важна адзначыць, што мы нашы падручнікі не проста перадрукоўваем, а мяняем перавыдаём, бо падчас падрыхтоўкі да перавыдання яны ўдасканальваюцца. Каб ад перавыдання да перавыдання навучальныя дапаможнікі рабіліся лепшымі, мы выкарыстоўваем некалькі механізмаў. Адзін з іх — доследная праверка, — расказала Людміла Раманоўская. — Яна добра сябе зарэкамендавала яшчэ за савецкім часам. Такую праверку праводзяць настаўнікі-практыкі: на працягу года яны працуюць з падручнікам, аналізуюць яго метадычны патэнцыял. За перыяд з 2016 да 2022 года доследную праверку прайшлі 109 новых навучальных дапаможнікаў. У ёй удзельнічалі 1042 педагогі з 800 устаноў адукацыі.

Таксама мы актыўна выкарыстоўваем такія каналы зваротнай сувязі, як анкетаванне. За час абнаўлення зместу агульнай сярэдняй адукацыі ўдзел у анкетаванні па пытаннях якасці абноўленых навучальных дапаможнікаў прынялі больш за 170 тысяч навучэнцаў і больш за 50 тысяч настаўнікаў. Вынікі анкетавання — не тайна для грамадскасці, з імі можна пазнаёміцца на Нацыянальным адукацыйным партале ў рубрыцы «Школьныя падручнікі. Пыталіся — адказваем». Там жа можна задаць пытанне аўтару навучальнага дапаможніка.

У выніку ўся інфармацыя ад удзельнікаў адукацыйнага працэсу акумулюецца, аналізуецца, абмяркоўваецца разам з аўтарскімі калектывамі. Сумесна выпрацоўваюцца тыя напрамкі, па якіх навучальны дапаможнік удасканальваецца, у тым ліку і ў ходзе рэдакцыйна-выдавецкай падрыхтоўкі. Дапрацоўцы падлягае не толькі дыдактычны матэрыял і змест навучальнага дапаможніка, але і афармленне, ілюстрацыйны матэрыял, спасылкі на дадатковы адукацыйны кантэнт.

Навучальныя дапаможнікі перавыдаюцца з пэўнай перыядычнасцю, якая залежыць ад таго, як часта яны выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе. Напрыклад, падручнікі, якія выкарыстоўваюцца чатыры разы на тыдзень, перавыдаюцца праз чатыры гады, калі дваццаць разы на тыдзень — праз пяць гадоў.

Дзіцячыя кнігі з дапоўненай рэальнасцю (AR) — ідэальны варыянт захапіць дзіця кнігай».

Па словах Людмілы Раманоўскай, вучэбныя выданні зведалі змены ў розных ступені: «Найбольш істотна абнавіліся да новага навучальнага года дапаможнікі па геаграфіі для шостага класа і па мастацтве — для пятага. «Аўтары і метадысты Нацыянальнага інстытута адукацыі добра папрацавалі з тэкстамі дапаможнікаў — яны аблегчаны, зменшана колькасць тэрмінаў, абавязковых для запамінання. Напрыклад, у дапрацаваным падручніку па геаграфіі для шостага класа скарочана тэкставая частка параграфаў, частка тэкставай інфармацыі пераведзена ў схемы і графікі, спрошчана выкладанне вучэбнага матэрыялу, выключана значная частка дадатковага матэрыялу, скарочана колькасць геаграфічнай наменклатуры.

У падручніку па мастацтве за кошт аблягчэння вучэбнага матэрыялу выдзелены спецыяльныя параграфы для правядзення ўрокаў творчасці. Праводзіць такія ўрокі ў канцы чвэрці было пажаданнем настаўнікаў.

Яшчэ адно змяненне звязана з электронным дадаткам да дапаможніка. Раней яно было на дыску (як і электронны дадатак да навучальных дапаможнікаў па замежных мовах). «Мы ўдасканалілі электронныя дадаткі з улікам таго, што нязручна на практыцы выкарыстоўваць дыскі. Электронны дадатак размешчаны ў воблаку з доступам праз QR-код. Гэта не толькі зручна, але яшчэ і значна пашырае адукацыйны кантэнт, дазваляе зрабіць працэс навучання максімальна эфектыўным. Электронны дадатак змяшчае вельмі шмат відэа- і аўдыёматэрыялаў: выявы архітэктурных збудаванняў, узоры выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у яго ўпершыню былі ўключаны фрагменты музычнага і кінамастацтва.

Людміла Раманоўская паведаміла, што ў верасні спаўняецца дваццаць гадоў Выдавецкаму цэнтру Нацыянальнага інстытута адукацыі. За гэты час яго спецыялістамі было падрыхтавана больш як 1200 найменняў вучэбных выданняў агульным тыражом 35 мільёнаў экзэмпляраў.

ПАДАРУНАК ПЕРШАКЛАСНІКУ

«Традыцыйна да 1 верасня ўсе першакласнікі нашай краіны атрымалі навучальнае выданне «Беларусь — наша Радзіма». Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку». Кніга мае сваю гісторыю. Яна выдаецца з 2014 года. А ў гэтым годзе выданне выйшла ў абноўленай канцэпцыі», — расказаў **дырэктар выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» Валянцін НАВАГРОДСКІ.**

Паводле яго слоў, захаваны найлепшыя традыцыі і асноўная ідэя навучальнага выдання. Разам з тым перагледжана структура дапаможніка, з'явіліся новыя тэматычныя раздзелы — зразумелыя, даступныя і цікавыя дзецям. Прыярытэт аддадзены раздзелу, прысвечанаму дасягненням сучаснай Беларусі. Абноўлены дызайн кніг і стыль малюнкаў. Выкарыстоўваюцца элементы інфаграфікі і схем. Напрыклад, разварот «Заўсёды ў памяці народнай» пабудаваны па прынцыпе падарожжа ў часе ад пачатку Вялікай Айчыннай вайны да сучасных мірных дзён.

Сярод навінак выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» — дапаможнік «Сістэма адукацыі Рэспублікі Беларусь»: у яго ўключаны розныя статыстычныя звесткі і цікавыя факты, якія можна выкарыстоўваць на школьных занятках, у тым ліку ў рамках праекта «ШАГ». Для факультатыву «Асновы духоўна-праваслаўнай культуры і патрыятызму» падрыхтаваныя дапаможнік для чытання, рабочы сшытак і ілюстраваны слоўнік.

Яшчэ адна навінка — навукова-папулярная серыя «Я ганаруся», заснаваная па заказе Міністэрства адукацыі і прымеркаваная да Года гістарычнай памяці. Яна прызначана для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Ужо падрыхтавана 14 кніжак невялікага фармату на беларускай і рускай мовах. Добра ілюстраваныя выданні знаёмяць маленькіх чытачоў з галоўнымі сімваламі нашай дзяржавы, славутасцямі Беларусі, спартыўнымі дасягненнямі і іншым. Выданні серыі «Беларускія школьнікі — героі Вялікай Айчыннай вайны» і «Вечная памяць герояў. Мемарыялы Беларусі» дапамогуць пашырыць веды малодшых школьнікаў пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, будуць спрыяць захаванню гістарычнай памяці аб подзвігу маленькіх герояў у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ва ўсіх кнігах серыі ўтрымліваюцца QR-коды з выхадам на аўдыяверсіі тэкстаў.

Вынікі анкетавання — не тайна для грамадскасці, з імі можна пазнаёміцца на Нацыянальным адукацыйным партале.

100 ПЫТАННЯЎ...

Дзіцячыя кнігі з дапоўненай рэальнасцю (AR) — ідэальны варыянт захапіць дзіця кнігай. Так лічаць у выдавецтве «Аверсэв». Стратэгічны кірунак у рабоце выдавецтва — развіццё літаратуры для дашкольнай адукацыі і пачатковай школы, бо гэта — самы важны і «ўдзячны» ўзрост, калі фарміруюцца тыя «парасткі», з якімі потым настаўнікам давядзецца працаваць.

Да новага навучальнага года тут падрыхтавалі дадаткі дапоўненай рэальнасці да навучальных дапаможнікаў па англійскай мове Magic Box 1. Pupil's Book. (1 клас) і Magic Box 2. Pupil's Book (2 клас). Гукавое афармленне з'яўляецца ўзорам правільнага вымаўлення і дапамагае запамінаць гучанне, рытм і інтанацыю англійскай гаворкі. З дапамогай гульняў і віктарын у дадатках школьнікі змогуць у лёгкай і займальнай форме замацаваць пройдзены матэрыял, а карцінкі, што ажываюць, актывізуюць увагу і выклікаюць станоўчыя эмоцыі ў працэсе навучання. Важна, каб першыя крокі ў вывучэнні англійскай мовы былі эмацыянальнымі і яркімі, каб працэс пагружэння ў чужую мову захапіў дзіця....

Дырэктар выдавецтва «Аверсэв» Дзмітрый ДЗЯМБОЎСКІ прадставіў таксама серыю хрэстаматый для дашкольнікаў «Чароўная скарбонка». Усе творы ў ёй былі агучаны прафесійнымі акцёрамі і іх можна праслухаць, напрыклад, перад сном. А да Дня пісьменства ў выдавецтве выпусцілі багата ілюстраваную кнігу «Мой родны край. Добруш». Яе атрымаюць у падарунак усе першакласнікі горада, які прымае свята ў гэтым годзе.

Намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар ШНІП пазнаёміў з навінкамі, якія педагогі і вучні змогуць выкарыстоўваць у навучальным працэсе. Адна з іх — кніга «Хлопцы самай вялікай вайны. 25 апавяданняў пра Вялікую Айчынную вайну». У зборнік увайшлі апавяданні вядомых беларускіх пісьменнікаў — Кузьмы Чорнага, Васіля Быкава, Івана Мележа, Івана Пташнікава, Івана Чыгрынава, Вячаслава Адамчыка, Міхася Стральцова і іншых, прысвечаныя тэме Вялікай Айчыннай вайны. У кожнага з аўтараў свая вайна: для адных гэта нялёгкія франтавыя дарогі, для іншых — апаленае дзяцінства. Але ў кожным з іх яна назаўсёды засталася незагойнай ранай, болем, якім пранізаны і напісаныя імі творы.

Добра ілюстраваныя выданні знаёмяць маленькіх чытачоў з галоўнымі сімваламі нашай дзяржавы, славутасцямі Беларусі, спартыўнымі дасягненнямі і іншым.

Яшчэ адна навінка, якую нельга абысці ўвагай, — зборнік «Як многа гавораць мне назвы такія». У яго ўвайшлі 100 вершаў, прысвечаныя беларускім гарадам і вёскам. Сабраныя пад адной вокладкай, яны ўяўляюць сабой своеасаблівую паэтычную карту Беларусі. Сярод аўтараў — прадстаўнікі самых розных літаратурных пакаленняў: Якуб Колас, Пятрусь Броўка, Максім Танк, Пімен Панчанка, Аркадзь Куляшоў, Рыгор Барадулін, Анатоль Вялюгін, Генадзь Бураўкін, Пятрусь Макаль, Аляксей Пысін, Яўгенія Янішчыц, Алесь Пісьмянкоў і іншыя. Многія творы зборніка даўно сталі айчыннай паэтычнай класікай.

Сапраўдным хітом «Мастацкай літаратуры» стала серыя «100 пытанняў пра Беларусь», якая аб'ядноўвае 10 кніг для малодшых школьнікаў — у кожнай па 10 пытанняў: «10 пытанняў пра беларусаў», «10 пытанняў пра нашых славутых гістарычных асоб», «10 пытанняў пра беларускія гарады і вёскі», «10 пытанняў пра беларускія рэкі і азёры», «10 пытанняў пра звяроў» і г. д.

А для пазакласнага чытання Віктар Шніп прапануе новую кнігу «Урок без перапынку». Вобразы настаўнікаў і вучняў у творах Якуба Коласа, Янкі Брыля, Івана Навуменкі, Васіля Быкава і іншых беларускіх пісьменнікаў нікога не пакінуць абыякавымі. Настаўнікі вучаць дзяцей, а дзеці — настаўнікаў, і гэта таксама класна...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Аб'ект варты ўвагі

Аўгустоўскі канал завяршае чарговы сезон

І хоць яго цеплаходы яшчэ стаяць на рэйдзе, каляндарная старонка масавых мерапрыемстваў ужо перагорнута. Тым не менш канал нават у будні не пустуе. Сюды прыязджаюць арганізаваныя альбо «дзікія» турысты. Сярод іх шмат замежнікаў, якія, як правіла, цэняць канал як гісторыка-культурны аб'ект. Але ці дастаткова гэтага?

ШТО ВАБІЦЬ?

Мы прыехалі на канал у будні дзень напрыканцы жнівеньскай спякоты. Апоўдні паркоўка на шлюзе Дамброўка не пуставала. Стаялі машыны не толькі з мясцовымі, але і сталічнымі, і замежнымі нумарамі. Напрыклад, з Гродна прыехала бабуля з двума ўнукамі, якія тут яшчэ не былі. Хлопчыкам спадабалася дзіцячая пляцоўка ў выглядзе вялікага карабля. Атракцыён з'явіўся ў гэтым сезоне.

Лебядзінае сямейства, убачыўшы людзей, прыплыло да самага берага. Для іх знайшоўся пачастунак ад турыстаў з Карэліі. Сям'я Папковых — Святлана і Леанід з дачкой Алесяй — у водпуску вырашылі павандраваць па Беларусі, пачалі з Гродна. У маршрут уключылі Аўгустоўскі канал, аб якім даведаліся з турыстычнага сайта. Старадаўняе гідратэхнічнае збудаванне зацікавіла жыхароў краіны азёр і рэк. Па словах Святланы, ім тут усё падабаецца: і сэрвіс, і гасцінасць, і жыллё. У параўнанні з расійскімі цэнамі, адпачынак значна таннейшы. Напрыклад, у Гродне двое сутак пражывання ў апартаментах абышліся за меншыя грошы, чым суткі ў больш сціплых умовах у Пскоўскай вобласці.

Праз некалькі хвілін на канал пад'ехаў аўтобус з групай турыстаў. Аказалася, выпускнікі Новасібірскага вышэйшага ваеннага вучылішча прыехалі да свайго гродзенскага аднагрупніка на традыцыйную сустрэчу. У праграму экскурсіі трапіў і Аўгустоўскі канал.

— Нам усё цікава, — прызнаўся Яўген Рыгоравіч з расійскага Томска. — Аб'ект варты ўвагі, відаць, што старадаўні. І прырода тут цудоўная, незабруджаная. Добра тут, душой адпачываем.

ШТО ЗДЗІЎЛЯЕ?

Замежнікі звяртаюць увагу на ўнікальнасць Аўгустоўскага канала. Ён захаваў гістарычную каштоўнасць, яго рэканструкцыя мела катэгорыю «0», гэта значыць, праводзілася з максімальным захаваннем аўтэнтычнасці. І гісторыя яго стварэння цікавая.

Канал пачаў будавацца амаль 200 гадоў таму і павінен быў злучыць Віслу і Нёман для выхаду ў Балтыйскае мора. Некалькі разоў рашэнне аб яго будаўніцтве адкладвалася, хоць ідэя была агучана яшчэ ў XVI стагоддзі падчас праўлення Стэфана Баторыя. Падпісаў указ аб будаўніцтве ў 1824 годзе расійскі імператар Аляксандр I. Канал будавалі 15 гадоў, у выніку атрымалася вельмі складанае гідратэхнічнае збудаванне агульнай працягласцю больш за 100 кіламетраў, з якіх 24 — на тэрыторыі Беларусі. Пасля працяглага перыяду заняпаду канал было вырашана ўзнавіць у якасці турыстычнага аб'екта. Указ аб рэканструкцыі быў падпісаны Прэзідэнтам Беларусі ў 2004 годзе, а ўжо праз два гады работы завяршыліся.

Канал стаў суднаходным і пачаў абрастаць турыстычнай інфраструктурай. У былым доміку назіральніка арганізаваны музей. З'явіліся альтанкі, паркоўкі, паштовае аддзяленне, гандлёвыя павільёны. Арганізаваны пракат лодак, катамаранаў і веласіпедаў. Курсіруюць два цеплаходы. У мінулым годзе на шлюзе Дамброўка ўстаноўлены бясплатны Wi-Fi і відэаназіранне.

Цяпер гэта месца правядзення шэрагу культурна-масавых фестываляў і свят, турслётаў, водных спаборніцтваў і проста прыемнага адпачынку.

Па словах старшыні Сапоцкінскага сельвыканкама Андрэя Садкоўскага, праз пасёлак на канал штодзень курсіруюць турыстычныя аўтобусы, бывае, што госці вяртаюцца адтуль ужо познім вечарам. Канал актыўна працягваюць асвойваць беларусы. Мяркуючы па нумарах машын, сюды едуць з усіх рэгіёнаў краіны.

Праўда, некаторыя гродзенцы заўважаюць, што Аўгустоўскі канал не настолькі цікавіць турыстаў, каб прыехаць сюды другі раз. Юрый, які прывёз сваяка з Латвіі, крытыкуе інфраструктуру на канале. Маўляў, аўтастаянак не хапае, недастаткова малых архітэктурных формаў, пляжы не абсталяваныя, а цеплаход значна скараціў свой маршрут...

А вось замежнаму госцю помнік гідратэхнічнага дойлідства спадабаўся. Мабыць, таму, што замежныя і іншагародніе турысты больш увагі аддаюць менавіта гістарычным асаблівасцям аб'екта. Напрыклад, аўтэнтычным шлюзам і развадным мастам, якія пры шлюзаванні падымаюцца і апускаюцца ўручную. Расце попыт на арэнду воднага інвентару і веласіпедаў, а таксама на экскурсіі на цеплаходах. Што датычыцца пляжных зон, то купацца тут забаронена, бо небяспечна. А вось над пашырэннем парковак, сапраўды, варта было б падумаць. Падчас масавых мерапрыемстваў чарга аўтамабіляў уздоўж трасы расцягваецца на сотні метраў.

ШТО БУДЗЕ?

Сам Аўгустоўскі канал — частка вялікай тэрыторыі, якая пазначаецца як «Парк «Аўгустоўскі канал». Па ім распрацаваны генеральны план развіцця. Па словах **галоўнага архітэктара Гродзенскага раёна Анатоля КАРАЛЯ,** на гэтым вялікім участку павінна быць цэлая сістэма турыстычных паслуг, якія паміж сабой ствараюць кааперацыю, ці, як прынята казаць, кластары. На яго думку, канал на ўсім працягу валодае вялікім турыстычным патэнцыялам.

— Вы бачыце на карце, які доўгі аб'ект. На гэтай нітцы можна стварыць цікавыя кластары, дзе кожны будзе прадстаўляць свае віды паслуг: водны, пешы ці веларызм, адпачынак на аграсядзібе і гэтак далей. У кожнага свой сектар. Тут безліч цікавага. Гэта і Аўгустоўская пушча, і азёры, і ваенны маршрут па лініі Молатава, і байдаркі. Многа цікавага можна знайсці ў навакольных вёсках. Тут нямала напрамкаў: археалагічны, і навуковы, і этнаграфічны, і гастранамічны. Рэсурсаў шмат, іх толькі варта задзейнічаць, — упэўнены суразмоўца.

Пакуль, як сцвярджае архітэктар, на самім канале прымаюць турыстаў толькі сядзібы, капітальных забудоў няма. Далей часовых павільёнаў і навесаў справа не ідзе, хоць тут пракладзены камунікацыі для падключэння электраэнергіі. Між тым на шлюзе Дамброўка праводзіцца нямала свят і фестываляў.

На суседнім шлюзе Нямнова распрацоўваецца праект па мадэрнізацыі былой турыстычнай базы. Эскізы ўжо ўзгоднены з аддзелам архітэктуры Гродзенскага райвыканкама. Пакуль гэта адзіны праект, які тут рэалізоўваецца. Была заява на пабудову гасцініцы на шлюзе Чарток, але справа так і не зрушылася з месца.

Па словах **старшыні Сапоцкінскага сельвыканкама Андрэя САДКОЎСКАГА,** усе, хто хацеў зайсці на канал з якім-небудзь бізнесам, гэта зрабілі. Зараз падрыхтавана тэрыторыя, якая дае магчымасць прыцягваць сюды новыя праекты. Хто хоча сябе рэалізаваць, можа гэтым заняцца, кажа прадстаўнік улады.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

Кніжныя навінкі

МУРЫ І ТОМ ВЫПРАЎЛЯЮЦЦА Ў ПАДАРОЖЖА

Днямі ў Выдавецкім доме «Звязда» выходзіць новая кніга — казачная аповесць Маргарыты ЛАТЫШКЕВІЧ «Муры, Том і дырыжаблік».



Пра што расказваецца ў кнізе, выпуск якой ажыццяўляецца па заказе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь? ...Над чароўным горадам Котсвілем плывуць планёры і дырыжаблі! А жыхары горада рыхтуюцца да Вялікай выставы. Маленькія кацяняты Муры і Том чакаюць дамоў свайго тату, капітана самага цудоўнага з усіх дырыжабляў. Але тата, на вялікі жаль, затрымліваецца! Што ж на самай справе здарылася з камандай самага цудоўнага паветранага судна? І якое дачыненне да гэтага надзвычайнага здарэння мае Егіпецкая зала вялікай выставы? Каб разабрацца ва ўсім гэтым і разам з аўтарам правесці сваё дэтэктыўна-казачнае расследаванне, далучыцеся да Коткінсаў, якія, быццам тыя Шэрлакхолмсы, справу сваю ведаюць, — і вы сустрэнецеся са старажытнымі чарамі з самых далёкіх краін.

Займальнае, напоўненае прыгодамі казачнае падарожжа падаецца даволі ілюстратыўным, здольным развіць багатае ўяўленне, яшчэ і таму, што ў кнігі, акрамя добра вядомай пісьменніцы Маргарыты Латышкевіч, ёсць вопытны суаўтар — **кніжны графік Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.** Майстар сваёй справы, яна пераканаўча ўводзіць чытача кнігі «Муры, Том і дырыжаблік» у самыя глыбінныя таямніцы даследавання. І хоць аповед у кнізе завяршаецца на цікай, спакойнай ноце («Мая сям'я стамілася і перахвалявалася, дый камандзе патрэбны адпачынак пасля вашых чараў. Усе мы заслужылі трохі спакою!» — гаворыць тата Коткінс), узнікае зразумелае чытацкае жаданне атрымаць працяг гэтай цудоўнай казкі, разлічанай не толькі на маленькіх чытачоў. Будзем спадзявацца, што Маргарыта Латышкевіч гэта пачуе — і неўзабаве ў яе народзіцца новая кніга. А яе паплечнікам у стварэнні працягу стане зноў мастачка Дар'я Чарняўская.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

Сведения о результатах проведения рекламной игры

«Выигрывай с Onliner Prime 2»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Заинтересованное лицо рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «МИ БАЙ», юридический адрес: 220007, г. Минск, ул. Аэродромная, 125, пом. 21, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 291478180, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 26.06.2017.

3. Сроки проведения рекламной игры: с 04.07.2022 по 05.09.2022 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения рекламной игры).

4. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4200, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 08.06.2022.

5. Количество участников рекламной игры – 534 чел.

6. Информация о призовом фонде:

Размер призового фонда рекламной игры составляет 8295 (восемь тысяч двести девяносто пять) белорусских рублей 52 (пятьдесят две) копейки. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

7. Информация о победителях рекламной игры:

№ п/п	Фамилия, инициалы победителя	Сведения о выигрыше
1	Колесник Д.Е.	Приз (тур № 1) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Space Black) (M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
2	Сошин И.С.	Приз (тур № 1) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Space Black) (M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
3	Герасимович Я.П.	Приз (тур № 1) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Moon White)(M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
4	Тимошевич А.Д.	Приз (тур № 1) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Moon White)(M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
5	Кривко Д.Н.	Приз (тур № 2) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Space Black) (M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
6	Иванишко В.П.	Приз (тур № 2) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Space Black) (M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
7	Рудько Т.В.	Приз (тур № 2) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Moon White)(M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
8	Герасимчук В.В.	Приз (тур № 2) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Moon White)(M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
9	Гомалинский В.А.	Приз (тур № 3) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Space Black) (M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
10	Гореликов В.Ф.	Приз (тур № 3) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Space Black) (M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
11	Громыко А.А.	Приз (тур № 3) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Moon White)(M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
12	Наркевич А.А.	Приз (тур № 3) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Moon White)(M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
13	Подворный Д.Д.	Приз (тур № 4) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Space Black) (M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
14	Чудаков О.Н.	Приз (тур № 4) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Space Black) (M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
15	Бобровский И.М.	Приз (тур № 4) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Moon White)(M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.
16	Хилькевич С.А.	Приз (тур № 4) – BHR5380GL Фитнес-браслет (смарт-часы) с экраном Xiaomi Watch S1 Active (Moon White)(M2116W1), денежные средства в размере 46,47 бел. руб.

8. Для получения приза победители должны явиться не позднее 05.09.2022 (включительно) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона: + 375 (29) 514 35 24.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

Слова пісьменніка

РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі



17 лістапада 2003 года ад пасады рэктара БДУ быў вызвалены прафесар Казулін. Тым самым ён перастаў быць старшынёю Савета рэктараў. Рэктарам БДУ Указам Прэзідэнта быў прызначаны былы міністр адукацыі, выпускнік БДУ, прафесар В. І. Стражаў. Да гэтага часу, так склалася, рэктар БДУ аўтаматычна станавіўся і старшынёю Савета рэктараў. Гэта было лагічна: БДУ — галоўная ВНУ краіны! Але ў мяне была іншая прапанова. З ёю я і пайшоў да Прэзідэнта.

Дакладваю:

— У Стражава ў БДУ будзе шмат працы ўнутры ўніверсітэта. У мяне на пасаду старшыні Савета рэктараў ёсць іншая кандыдатура.

Прэзідэнт зацікаўлена пытаецца:

— І якая ж?

— Шымаў!

Аляксандр Рыгоравіч пасля нядоўгай паўзы гаворыць:

— А я згодны! Шымаў не падвядзе, я гэта ведаю!

Уладзімір Мікалаевіч узначальваў Савет рэктараў з 2003 да 2019 года. Мяняліся рэктары, міністры, а старшыня Савета рэктараў выконваў функцыі каардынатара кіраўнікоў ВНУ ў забеспячэнні якаснай працы і развіцці вышэйшай адукацыі ў краіне.

Як правіла, мы былі адзінымі ў падыходзе да вырашэння праблем, але часам і разыходзіліся. Шымаў быў загартаваны горалам працы ва ўрадзе, там яму шматкратна даводзілася вытрымліваць пазіцыю, бо кожны міністр сцяной стаіць за выгадную для яго галіны эканоміку, а міністр эканомікі адказвае за эканамічны дабрабыт усёй краіны, што, у прыватнасці, ушчамляе многія жаданні галіновых кіраўнікоў. Напрыклад, бойкі за бюджэтнае фінансаванне на пасяджэннях Савета Міністраў заўсёды былі не на жарт. Калі я на іх ішоў, то прымушаў увесь апарат міністэрства рыхтаваць неабходныя абгрунтаванні і дакументы з гранічнай адказнасцю, рабіў заяву, што іду на вайну. Таму вопытны Шымаў і як рэктар у любых абставінах выкладаў сваю пазіцыю, нават калі яна ішла насуперак меркаванню міністра. Але, па-першае, яна заўсёды была абгрунтаванай, на крайні выпадак з яго пункту гледжання, па-другое, ён заўзята не настойваў, лічыў, што канчатковае меркаванне за міністрам як за кіраўніком, і, па-трэцяе, пасля прыняцця рашэння добрасумленна яго выконваў, няхай яно і пярэчыла яго меркаванню. Мне ён гаварыў, што паважае таго кіраўніка, які дазваляе выказаць сваю пазіцыю, хаця б выказаць.

Эканамічны ўніверсітэт пры рэктары Шымаве стаў набіраць, паказаўся новымі краскамі. Ён сам інтэнсіўна займаўся навуковай працай, пісаў вучэбныя дапаможнікі, кіраваў дактарантамі і аспірантамі, асабіста ўзначальваў спецыялізаваны савет па абароне доктарскіх дысертацый, удумліва прызначаў кадры. І грашыма ён распараджаўся ўзважана! Стараўся забяспечыць выкладчыкаў узроўневым заробкам, паслядоўна рамантаваў вучэбныя карпусы, інтэрнаты. Мне, у прыватнасці, падабалася ў яго ўніверсітэцкая сталовая: мала таго што там смачна і нядорага кармілі, яна была прасторная, і студэнты маглі за столікамі не толькі перакусіць, але і зручна размясціцца са сваімі ноўтбукамі, іх ніхто не выганяў! Думаю, рэктар Шымаў укараняў еўрапейскую ўніверсітэцкую культуру. Дарэчы, і шмат хто з замежнікаў з розных куткоў свету выбіраў для вучобы Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, а, напрыклад, з Сарбонаю быў заключаны дагавор аб супрацоўніцтве і выдачы выпускнікам двайных дыпломаў.

Наша эканамічная школа вядомая далёка за межамі краіны! І БДЭУ ў эканамічнай адукацыі краіны заняў сваё прыкметнае месца. Я гэта выразна зразумеў, калі аднойчы адказваў на пытанне віцэ-прэм'ера А. М. Касінца. Ён — доктар-хірург, доктар медыцынскіх навук, мы з ім былі знаёмы яшчэ як рэктары, Аляксандр Мікалаевіч — Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта, а я — Магілёўскага ўніверсітэта. Пасля прызначэння віцэ-прэм'ерам ён захацеў атрымаць эканамічную адукацыю ў магістратуры і запытаўся мяне, дзе лепей гэта зрабіць. Я, не задумваючыся, адказаў, што ў БДУ болей вывучаюць эканамічную тэорыю, а ў БНТУ — эканоміку прадпрыемства, а рэальную эканоміку ва ўсіх яе праявах — у Шымава ў «наргасе».

Уладзімір Мікалаевіч быў надзвычай карысны ў вызначэнні балансаў бюджэтнага і платнага навучання, стварэнні парога дапушчальнасці развіцця бізнесу ў гэтай адукацыйнай сферы, разліку платы за навучанне, даступнай нашым людзям. Каротка адхіленне на гэтую тэму.

Калі праблему колькасці студэнтаў у краіне і квот платнага навучання я ўзняў у размове з Прэзідэнтам, Аляксандр Рыгоравіч задумліва сказаў:

— Як жа мы можам адмовіць чалавеку ў жаданні вучыцца, тым болей за свой кошт?! Няхай нават пасля ўніверсітэта ён будзе стаяць за станком, гэта ж будзе чалавек высокай культуры!

І ўсё ж пытанне колькасці студэнтаў па розных спецыяльнасцях хвалявала многіх. Шымава асабліва абурала практычнае клішэ пра лішак у нашай краіне юрыстаў і эканамістаў. Тое, што ў нас развіваецца рыначная эканоміка, і, адпаведна, бізнес, прадпрымальніцтва патрабуюць для кожнай фірмы і фірмачкі менавіта гэтых спецыялістаў, мала каго хвалявала. Старшыня Нацыянальнага банка Пётр Пятровіч Пракаповіч быў цалкам на баку Шымава, адкрыта заяўляючы, што ў нашай краіне трыццаць банкаў, а павінна быць трыста. І там патрэбны ўсё тыя самыя эканамісты і юрысты.

Няпроста было знайсці і аптымальную колькасць падрыхтоўкі праграмістаў, спецыялістаў для ІТ-сферы. Пастаянна даражыў гэтае пытанне дырэктар Парка высокіх тэхналогій В. В. Цэпкала. Ён стараўся пераканаць Прэзідэнта, што нам патрэбна ў дзесяць разоў павялічыць падрыхтоўку праграмістаў. Мы рыхтуем 6000, а трэба, з яго пункту гледжання, — 60 000.

Прэзідэнт патрабаваў ад мяне абгрунтаванняў. Мы з Шымавым падрыхтавалі дзве круглыя дыяграмы. На адной паказалі размеркаванне выпускнікоў сярэдніх школ па адукацыйных узроўнях: прафтэхвучылішчы, каледжы, вышэйшыя навучальныя ўстановы. На другой — размеркаванне студэнтаў ВНУ па спецыяльнасцях: інжынеры, аграномы, тэхналогі, урачы, настаўнікі, вайскоўцы. Адкуль узяць студэнтаў для такога рэзкага павелічэння падрыхтоўкі праграмістаў? Нам жа ў краіне патрэбны і механізатары для сельскай гаспадаркі, і слесары для прамысловых прадпрыемстваў, і вадзіцелі, і касіры-гандляры, і медсёстры, і ўрачы, і інжынеры, і вайскоўцы. У час даклада Прэзідэнту, паказваючы гэтыя дыяграмы, я кажу, што ў тры разы павялічыць падрыхтоўку для ІТ-сферы нам дазваляюць нават сёння і матэрыяльная, і кадравая базы. Пры гэтым усім зразумела, што для Беларусі развіццё ІТ-сферы выгадна: яна не патрабуе прыродных рэсурсаў, імкліва развіваецца і прыкметна прыбытковая. У нас людзі з высокім інтэлектам, у гэтым кірунку прадукцыйна працуюць беларускія навуковыя школы, каманда праграмістаў БДУ — адна з найлепшых у свеце, а гомельскі школьнік Гена Караткевіч на міжнародных алімпіядах па інфарматыцы ўвогуле непераможны. Прэзідэнт, выслухаўшы ўсе гэтыя меркаванні, заўважае:

— Так, мы можам павялічыць падрыхтоўку такіх спецыялістаў і трэба гэта зрабіць. Але таксама трэба думаць, куды пасля іх уладкуем і за кошт каго павялічым прыём на гэтыя спецыяльнасці. Усё трэба ўзважыць і рабіць з розумам!

Да Шымава ва ўніверсітэт студэнты ішлі. Прахадны бал быў высокі нават для навучання на платнай аснове. Таму фінансавыя магчымасці ў яго былі. І распараджаўся ён імі мудра: заробак, абсталяванне, рамонты. Шымаў правільна працаваў з банкамі: уклады пад выгадныя працэнты, дэпазіты, валютныя рахункі, таму грошы ў яго заставаліся і на будаўніцтва. Рэктар задумаў спартыўны комплекс з гульнявой залаю, памяшканнямі для заняткаў сілавымі і гімнастычнымі відамі спорту, басейнам для плавання. Грошай на ўсё не хапала, і Уладзімір Мікалаевіч папрасіў бюджэтнае фінансаванне, пяцьдзясят на пяцьдзясят. Я пагадзіўся. Па-першае, Шымаў — чалавек, які трымае слова, за будоўляй будзе назіраць асабіста, па-другое, ва ўніверсітэце спорт аўтарытэтны, студэнты трапляюць у многія зборныя каманды краіны (чаго толькі вартая іх выпускніца Дар'я Домрачава), па-трэцяе, такі падыход да выкарыстання пазабюджэтных сродкаў — прыклад для многіх рэктараў, а галоўнае — як можа ўніверсітэт такога ўзроўню абысціся без належнага фізкультурнага блока? Па прапанове міністэрства будаўніцтва спартыўнага комплексу эканамічнага ўніверсітэта ўключылі Указам Прэзідэнта ў Інвестпраграму.

Шымаў заключыў з будаўнікамі адпаведную дамову і ўважліва сачыў за будаўніцтвам. Тыя ў вызначаныя тэрміны ўкладаліся, але прымаць аб'ект напрыканцы года рэктар катэгарычна адмовіўся: стаў працякаць басейн. Будаўнікі скрозь слёзы прасілі падпісаць акты пра гатоўнасць аб'екта да эксплуатацыі, інакш не выконваецца Указ Прэзідэнта і з гэтага вынікаюць меры дысцыплінарнага ўздзеяння. Выканаўцам Інвестпраграмы было і міністэрства, таму я асабіста паехаў ва ўніверсітэт пераконваць Уладзіміра Мікалаевіча прыняць аб'ект у эксплуатацыю напрыканцы года. Будаўнікі абяцалі за тры месяцы ліквідаваць недапрацоўкі. Калі мы не пойдзем ім насустрач, то ўсе атрымаем пакаранне за невыкананне ўказа і пасля трэба будзе прасіць Прэзідэнта пра перанос уводу аб'екта на паўгода, увесь гэты час будаўнікі з крыўдай на нас будуць валакіціць будоўлю, і не факт, што канчаткова ліквідуюць на аб'екце ўсе недахопы. А калі пойдзем ім насустрач — яны будуць абавязаныя нам, пастараюцца адказаць нам дабром. Шымаў пагадзіўся пры ўмове, што даводку будоўлі мы будзем кантраляваць удвух.

Будаўнікі не падвялі! Ужо ў красавіку мы з кіраўніцтвам будаўнічага трэста № 7, прарабам, майстрамі і брыгадзірамі самым уважлівым чынам прымалі канчаткова завершаны спартыўны комплекс. Ён быў настолькі добры, што рэктар прапанаваў запрасіць на адкрыццё Прэзідэнта, паказаць яму, як можна канчаткова распараджацца грашовымі сродкамі ўніверсітэта і забяспечваць студэнтам арганізацыю здаровага ладу жыцця. Шымаў нават планаваў прапанаваць ахвотным платныя аздараўленчыя паслугі. Эканаміст у ім жыў заўсёды!

Пасля старанная агляду спартыўнага комплексу мы з Уладзімірам Мікалаевічам вырашылі для будаўнікоў зрабіць прыём. Пры пераходзе ў будынак сталовай на фуршэт я ўбачыў чыстае зорнае неба і вырашыў паказаць усёй камандзе зімовыя сузор'і. Напоўніцу ззяў Арыён, акружаны Вялікімі і Малымі Сабакамі, Блізнятамі, Вознікам, Цяльцом. Зырка гарэлі Бетэльгейзэ, Сірыус, Капэла, Альдэбаран. Захапленне памерамі і далечынёю гэтых свяціл змянялася трывогай чакання хуткага выбуху самай яскравай зоркі Арыёна. А яшчэ легенды пра сузор'і... Уявіце: сорак дарослых, самавітых мужчын зачаравана ўзіраюцца ў касмічную прыгажосць. Уладзімір Мікалаевіч ціха мне на вуха сказаў:

— Мы цяпер з гэтымі будаўнікамі можам узяцца за любы аб'ект.

Прэзідэнт даў згоду на наведванне ўніверсітэта, ён выказаў жаданне не толькі агледзець новы спартыўны комплекс, але і выступіць з лекцыяй пра сучаснае эканамічнае становішча краіны перад студэнтамі. Рэктар вырашыў паказаць сваю спартыўную базу ў дзеянні — басейн, усе памяшканні і трэнажорныя залы былі запоўнены, ішлі заняткі ў адпаведнасці з раскладам. У гульнявой зале супрацьстаялі адна другой юнацкія валейбольныя каманды. Раўнадушна прайсці міма іх не даваў напал сапраўднага спартыўнага бою. Каманды былі ўкамплектаваны добрымі спартсменамі, вылучаліся яркія лідары, гульцы ў спартыўным азарце не заўважалі высокіх гасцей. Уся дэлегацыя на чале з Прэзідэнтам застыла каля валейбольнай пляцоўкі. Было відавочна, што Аляксандр Рыгоравіч захапіўся спартыўным паядынкам, які разгарнуўся ў нас на вачах. Ён дачакаўся завяршэння партыі і падышоў да спартсменаў — з разуменнем справы яны захоплена пачалі абмяркоўваць самыя вострыя моманты гульні. Пасля гэтага Прэзідэнт завітаў да студэнтаў у аўдыторыю і з пад'ёмам пачытаў ім лекцыю аб праблемах сусветнай эканамічнай палітыкі, аб ступені яе ўплыву на развіццё нашай краіны, аб стратэгіі развіцця нацыянальнай эканомікі.

Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.

(Працяг будзе 10 верасня.)

(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая, 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня, 13, 20, 27 жніўня.)

ДАПАМАГАЮЦЬ ТАБЕ — ДАПАМАЖЫ ІНШЫМ

Гуманітарныя грузы для пацярпелых і прытулкі для бежанцаў

Чалавецтва жыве ў свеце, дзе штогод стыхійныя бедствы, катастрофы, пандэміі, войны і канфлікты прычыняюць вялізныя пакуты. І тэндэнцыя на абвастрэнне і ўзмацненне гэтых праяў працягваецца. На Зямлі 100 мільёнаў вымушаных перасяленцаў, а яшчэ дзесяцігоддзе таму іх было ўтрая менш. Адпаведна, узрастае і неабходнасць аказання гуманітарнай дапамогі ўсім, хто мае патрэбу. Як наша краіна ўдзельнічае ў міжнароднай дабрачыннасці, расказалі спецыялісты.

Фота БелТА.

АД ЭКВАДОРА ДА ЯПОНІІ

Сусветны дзень гуманітарнай дапамогі, якая базіруецца на прынцыпах гуманнасці, бесстароннасці, нейтральнасці і незалежнасці, быў зацверджаны рэзалюцыяй Генеральнай асамблеі ААН у снежні 2008-га, абазначыў **Вадзім ПІСАРЭВІЧ, начальнік упраўлення ўстойлівага развіцця Міністэрства замежных спраў:**

— Беларусь як дзяржава з сярэднім узроўнем прыбытку сама з'яўляецца атрымальнікам міжнароднай дапамогі, аднак наша краіна актыўна ўцягнута ў міжнародную гуманітарную дзейнасць. Гэта вынікае з нашых ініцыятыў, скіраваных на аб'яднанне міжнароднай суполкі.

У межах СНД, напрыклад, Беларусь неаднаразова аказвала дапамогу Таджыкістану (летась у краіну перададзена 41 тона гуманітарнай дапамогі). Апошнія два гады дзясяткі дзяцей з Узбекістана адпачываюць у беларускім летніку «Зубраня». Дапамагае Беларусь і шэрагу краін так званай далёкай дугі — гуманітарную дапамогу ад беларусаў атрымалі Эквадор, Венесуэла, Куба, Кітай, В'етнам, Сірыя. Аказвалася дапамога і развітым краінам. З 2012 года наша краіна прымае на аздараўленне японскіх дзяцей, пацярпелых ад аварыі на АЭС «Фукусіма-1».

КРЫЗІС МІГРАНТАЎ

Беларусь актыўна ўзаемадзейнічае з міжнароднымі арганізацыямі, уцягнутымі ў гуманітарную дзейнасць, і, з'яўляючыся членам іх дырэктыўных органаў, уносіць уклад у вызначэнне палітыкі гэтых структур па аказанні гуманітарнай дапамогі. Асабліва яскрава гэта праявілася ў другой палове мінулага года падчас так званага крызісу мігрантаў на граніцы Беларусі з краінамі Еўрапейскага саюза, заўважыў прадстаўнік МЗС:

— Мы арганізавалі шэраг місій для УВКБ (упраўлення вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў), міжнароднай арганізацыі па міграцыі, Міжнароднай федэрацыі Чырвонага Крыжа ў месцах сканцэнтравання мігрантаў, аказвалі ўсялякую дапамогу гэтым людзям, хоць амаль ніхто з іх не прасіў прытулку ў нашай краіне.

За дынамікай вымушанага масавага перамяшчэння людзей па планеце, якая пастаянна расце, стаяць войны і канфлікты. Аднак, аказваючы гуманітарную дапамогу, міжнародныя суполкі, па сутнасці, займаюцца наступствамі праблемы, а ў меншай меры — яе першапрычынамі. Не знайшоўшы іх, праблему бежанцаў ніколі не ўдасца вырашыць, і, адпаведна, гуманітарная дапамога будзе толькі павялічвацца, дадаў Вадзім Пісарэвіч.

СТЫХІЙНЫЯ БЕДСТВЫ І РУКАТВОРНЫЯ КРЫЗІСЫ

Беларусь займае актыўную пазіцыю па пытаннях аказання гуманітарнай дапамогі дзяржавам, пацярпелым у выніку надзвычайных сітуацый, стыхійных бедстваў і іншых крызісных сітуацый, падкрэсліў **Яўген БАРАНОЎСКІ, памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях (МНС):**

— Мы дынамічна супрацоўнічаем з замежнымі аварыйна-ратавальнымі ведамствамі і міжнароднымі арганізацыямі. Незалежна ад знешнепалітычнай кан'юнктуры наша краіна заўжды дэманстравала імкненне дапамагчы іншым народам і дзяржавам, якія трапілі ў бяду, тым самым заваяваўшы высокі гуманітарны імідж на міжнароднай арэне.

Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння «Зубр» Міністэрства па надзвычайных сітуацыях атэставаны па міжнародных стандартах ААН як міжнародны пошукава-ратавальны атрад цяжкага класа. У свеце толькі 35 такіх падраздзяленняў. Гэтыя людзі могуць на працягу дзесяці гадзін з моманту атрымання запыту аб дапамозе адрэагаваць на яго і выехаць у іншую краіну, дзе працаваць у аўтаномным рэжыме дзесяці дзён, прывёў прыклад спецыяліст:

— Беларуская авіяцыя МНС сёння — адзін з самых эфектыўных інструментаў барацьбы з лясны мі пажарамі і дастаўкі гуманітарных грузаў і персаналу. Уласная вытворчасць лекавых сродкаў, харчавання, аварыйна-ратавальнай, рамонтнай тэхнікі таксама эфектыўна прымяняецца ў гуманітарнай дзейнасці. Гуманітарнае рэагаванне і аказанне дапамогі толькі тады карыснае, калі накіроўваецца своечасова.

Беларускія ратавальнікі гатовы рэагаваць на наступствы затапленняў, хімічных аварый, лясных пажараў і іншых крытычных праяў. Неаднаразова яны аказвалі дапамогу пацярпелым рэгіёнам у Расіі, сем разоў — Кітаю, шэсць — Украіне, пяць — Таджыкістану, чатыры — Малдове, тры — Кіргізіі, два — Турцыі, прывёў невялікую статыстыку **Аляксей ІОФЕ, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аварыйна-ратавальных службаў і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС:**

— Айчынная авіяцыя актыўна дапамагала тушыць пажары ў Баржомскай цясніне ў Грузіі ў 2017 годзе. У 2018-м — пажары ў цяжкадаступных рэгіёнах Латвіі. У 2010-м дапамагалі змагацца з лясным пажарам у Растоўскай і Тамбоўскай абласцях Расіі. У 2014 годзе зводны атрад у складзе авіяцыі і вадалазаў-ратавальнікаў дапамагаў насельніцтву ў Сербіі пасля затаплення.

Аднак краіны сутыкаюцца не толькі са стыхійнымі бедствамі, але і з рукатворнымі крызісамі. Напрыклад, зацяжны ваенізаваны канфлікт у Сірыі, куды Беларусь неаднаразова накіроўвала дапамогу, у тым ліку дзве партыі гуманітарнага грузу напрыканцы мінулага года. На Кубу, якая перажыла харчовы і эканамічны стрэс праз санкцыі ЗША, Беларусь морам накіравала тры кантэйнеры з лекамі і харчаваннем. Падчас міграцыйнага крызісу ў Таджыкістане Беларусь дапамагла абсталяваннем і маёмасцю для ўладкавання пунктаў часовага размяшчэння насельніцтва. Апошнія гады накіроўваецца гуманітарная дапамога і ва Украіну.

Сёння Беларусь можа не толькі дасылаць гуманітарную дапамогу, але і рэалізоўваць комплекс мерапрыемстваў, якія накіраваны на аднаўленне крытычнай інфраструктуры і нармалізацыю жыццядзейнасці, заўважыў Яўген Бараноўскі.

АСАБЛІВЫ РОСТ

Усю гуманітарную дзейнасць у Беларусі каардынуе Чырвоны Крыж, які супрацоўнічае з мноствам ведамстваў у краіне, каб эфектыўна дапамагаць ратавальнікам. Самае надзённае зараз — работа з бежанцамі, падзяліўся **Дзмітрый ШАЎЦОЎ, генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа:**

— Пад апекай Чырвонага Крыжа знаходзіцца каля чатырох тысяч чалавек. Нам дапамагаюць у гэтым прадпрыемствы, звычайныя беларусы, міжнародныя аб'яднанні (ЮНІСЕФ, ПРААН). Акрамя харчавання, адзення, дапамогі ў працаўладкаванні, ім аказваецца псіхалагічная дапамога, магчымасць аздараўлення дзяцей і збору іх у школу.

Не забываецца Чырвоны Крыж і на іншых асоб, якія церпяць нястачу, у тым ліку і беларусаў. Адзінокія, інваліды, асобы без пэўнага месца жыхарства, грамадзяне, якія вызваліліся з турмаў. Пры гэтым большая частка памочнікаў арганізацыі — валанцёры, дадаў Дзмітрый Шаўцоў.

Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) у рамках сваіх паўнамоцтваў таксама аказвае дапамогу іншаземным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія апасаюцца пераследу ў краіне грамадзянскай прыналежнасці ці папярэдняга месца жыхарства або прыбылі ў Беларусь, ратуючыся ад узброенага канфлікту ці па іншых прычынах, падкрэсліў **Аляксей БЯГУН, начальнік дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС:**

— Калі пералічаныя асобы звяртаюцца да адпаведных супрацоўнікаў на граніцы ці ўжо на тэрыторыі Беларусі з хадайніцтвам аб наданні ім статусу бежанца ці дадатковай абароны, яны маюць усе працэдуры доступу да статусу бежанца ці дадатковай абароны адпаведна з міжнароднымі стандартамі ў сферы вымушанай міграцыі.

Шмат замежнікаў засталося ў Беларусі з пачатку пандэміі, калі многія не змаглі вярнуцца на радзіму праз закрыццё ўезду ў іх родныя дзяржавы. Такім людзям МУС працягнула магчымасць знаходжання ў нашай краіне. Дагэтуль у нас па гуманітарных прычынах знаходзяцца грамадзяне Туркменістана, якія праз закрыццё авіяцыйных шляхоў зносін з гэтай дзяржавай і заканчэнне навучання ў ВНУ ў Беларусі таксама не могуць выехаць за яе межы. Ім садзейнічаюць у працаўладкаванні, меддапамозе і жыллі, дадаў прадстаўнік МУС.

А сёлета адзначаецца асаблівы рост (самы масавы з часоў незалежнасці нашай краіны) колькасці хадайніцтваў аб наданні статусу бежанца ці дадатковай абароне — ад грамадзян Украіны і іншых асоб. Атрымана больш за 1600 такіх хадайніцтваў ад замежнікаў, а ў краіну з пачатку спецаперацыі ва Украіне ўехала больш як 40 тысяч украінцаў.

— Нацыянальная сістэма прытулку спраўляецца з вялізным наплывам і працуе ў штатным рэжыме, — падкрэсліў Аляксей Бягун.

Ірына СІДАРОК.

ЭЛІКСІР ЗДАРОЎЯ

Купляем мёд: дзе, які, пачым?

Калі казаць пра «здаровыя прадукты» — то-бок пра тое, што ўключыць у рацыён для добрага самаадчування, даўгалецця і моцнага імунітэту, дзевяць з дзесяці сучасных людзей першым у спісе назавуць мёд. І нездарма. Гэты ўнікальны прыродны «вітамінны комплекс» паскарае выздараўленне пры прастудах і грыпе, падтрымлівае імунітэт, умацоўвае сасуды, выводзіць таксіны і шлакі. У нашы дні мёд прадаецца круглы год, але спецыяльна па мёд адпраўляцца на рынак або да знаёмага пчаляра мэтазгодна восенню, звычайна ў верасні. Як купіць сапраўдны мёд? І ў якую суму абыдзецца спажыўцу «эліксір здароўя» ў гэтым годзе?

Фота Бел ТА.

Шанц набыць «няправільны мёд» для чалавека, што ў мёдзе не разбіраецца, у сезон ёсць. Але «няправільныя» пчолы тут вінаватыя не заўсёды — часам вінаватыя «няправільныя» прадаўцы. Варта разумець, што прадукт на прылаўку, хутчэй за ўсё, вы набываеце не непасрэдна ў пчаляроў.

Так казаў Віні Пух

Мёд сапраўды прадукт, які валодае ўнікальнымі якасцямі, распавялі ў РНПЦ харчавання НАН Беларусі.

Лепш не купляць мёд на аўтатрасах або прыпынках грамадскага транспарту. Выбіраем буйныя рынкі, дзе адміністрацыя сочыць за якасцю тавару, або павільёны фірменнага гандлю пчаляроў.

Гэта так званы прыродны антыбіётык. Антыбактэрыяльны эфект мёду абумоўлены ўтрыманнем у ім пераксіду вадароду. Мёд выкарыстоўваецца ў традыцыйнай медыцыне пры лячэнні туберкулёзу, хвароб вачэй, інфекцый горла, бранхіяльнай астмы, заражэння гельмінтамі, экзэмы, запораў, для гаення язваў і г. д. Са старажытных часоў мёд наносілі на раны для гаення і прадухілення развіцця інфекцыі. Сучасная медыцына даказала эфектыўнасць выкарыстання мёду супраць залацістага стафілакоку, а таксама супраць многіх бактэрыяльных патагенаў і грыбкоў. Але гаворка ідзе аб якасным мёдзе. Няякасны — у лепшым выпадку ўсяго толькі адкладзецца на таліі ў выглядзе лішніх складачак, што псуюць настрой. «Няправільным» мёд можа быць па розных прычынах — напрыклад, недаспелы. А таксама разведзены, цукровы і наогул штучны. «Няправільныя пчолы» таксама могуць быць датычныя: напрыклад, мёд закупілі оптам у чалавека, які апрацаваў сваіх пчол антыбіётыкамі. Або нектар пчолкі збіралі з апрацаваных якімі-небудзь хімічнымі прэпаратамі раслін.

Недаспелы мёд — той, які забралі ў пчол раней за патрэбны час. Нектар, які пчолы прыносяць у вулей, — гэта больш за 50 % вады, якая павінна выпарыцца ў працэсе паспявання мёду. За гэты час мёд і набывае тыя самыя карысныя ўласцівасці, якія мы пералічылі вышэй. Нутрыцыёлагі адзначаюць, што вільготнасць сталага мёду — не больш за 19-20 %. Калі вады больш, мёд будзе нашмат менш карысны, да таго ж ён мае ўласцівасць хутка псавацца.

«Цукровы мёд» — гэта і не мёд зусім: карысныя ўласцівасці ў ім адсутнічаюць, застаецца толькі слодыч і «эфект плацэба». Атрымліваецца ён, калі замест нектара пчолы сілкаваліся цукровым сіропам.

No money — no honey

У славянскіх краінах грамадзяне, якія ведаюць англійскую мову, часам выкарыстоўваюць прыказку «No money — no honey», то-бок «Няма грошай — няма мёду». Лінгвісты кажуць, што на самай справе прыказка гучыць інакш: «No bees — no honey, no work — no money» (няма пчол — няма мёду, няма працы — няма грошай), і перакласці яе зручней за ўсё рускай ідыёмай «Без труда не выловишь и рыбку из пруда». У нас, скарацыўшыся, прыказка набыла іншы нюансы сэнсу — маўляў, «за задавальненне прыйдзецца заплаціць». Аб чым гэта я? Ды аб тым, колькі сёння спажыўцу прыйдзецца заплаціць за мёд. Тры літры гэтай восенню абыдуцца непасрэдна ў пчаляроў у суму парадку 45—50 рублёў. На рынку літр мёду ў сярэднім каштуе 20 рублёў. Даражэй за ўсё — грэцкі і лясны, гэтыя віды будуць каштаваць 22 рублі за літр.

Ад чаго залежыць кошт мёду? Як заўсёды, ад эксклюзіўнасці прадукту і складанасці яго атрымання. Напрыклад, ліпавы мёд даражэйшы: перыяд цвіцення ліпы драбналістнай, з якой збіраюць нектар пчолы, кароткі, і такога мёду заўсёды менш, чым іншых відаў. А вось рапсавага мёду, напрыклад, пчолы збіраюць больш, і таму ён таннейшы. Таксама ўлічваюцца транспартныя выдаткі.

Пакупнікі, маладзейшыя за 30, больш схільныя да ўсякага роду «вынаходстваў»: мёд з даданнем ягад (напрыклад, працёртай маліны) і арэхаў разлічаны ў большай ступені на іх.

— Лугавы мёд — вуллі на лузе (у нас пасекі ў дзвюх вёсках), і везці іх нікуды не трэба, — растлумачылі ў фірменным кіёску сямейнай пасекі з Гродзенскай вобласці. — А на грэчку мы возім, і ў лес таксама. Таму грэцкі і лясны мёд даражэйшыя.

У нашых шыротах можна сустрэць каля 7-8 відаў мёду. А ўсяго ў свеце іх больш за шэсць дзясяткаў. Гатунак мёду залежыць ад раслін, з якіх пчолы збіраюць нектар. На рынках гэтай восенню, як заўсёды, прадстаўлены і цёмныя, і светлыя гатункі.

— Якія з іх больш карысныя? Ну, гэта на аматара. Самымі карыснымі лічацца цёмныя гатункі, але яны проста валодаюць больш выразным смакам і мікраэлементаў у іх больш, чым у светлых. Затое яны больш алергенныя, — тлумачыць прадавец мёду Святлана. — Светлыя гатункі маюць меней выразную слодыч і водар ў іх больш далікатны. Сама я люблю найбольш светлы, рапсавы мёд — ён на смак падобны нават не на мёд, а на карамель.

Абсалютна ўсе гатункі мёду валодаюць супрацьпрастудным дзеяннем, кажа суразмоўніца. Але ў розных відаў ёсць і свае асаблівыя якасці. Напрыклад, ліпавы мёд лічыцца найбольш каштоўным — акрамя ўзмацнення імунітэту ён нармалізуе работу страваваль-най сістэмы, падтрымлівае працаздольнасць нырак і жоўцевага пузыра, мае мачагонны эфект і павышае стрэсаўстойлівасць. Якасны ліпавы мёд мае драўняныя ноткі ў водары і лёгкі карамельны прысмак. Грэцкі мёд — цёмна-карычневы. Дакладней, колеру цёмнага бурштыну. Галоўная яго каштоўнасць — у высокім утрыманні жалеза, таму менавіта гэты гатунак падыдзе тым, у каго нізкі гемаглабін. Яшчэ ён змяшчае медзь, кальцый, фосфар і цынк. Валодае яскравымі антысептычнымі ўласцівасцямі (пры пнеўманіі, а таксама ковідзе лепш выбіраць менавіта яго). Да таго ж ён здольны нармалізаваць мікрафлору кішэчніка (напрыклад, пасля працяглага прыёму антыбіётыкаў). Так званы лугавы мёд аднаўляе мышцы пасля фізічных нагрузак і падтрымлівае цэнтральную нервовую сістэму.

— Лугавы майскі мёд у нас з рапсам, — кажа прадавец з Гродзенскай сямейнай пасекі. — Рапсавы мёд валодае выяўленым аднаўляльным дзеяннем — усе тканінкі і клеткі пры рэгулярным яго ўжыванні аднаўляюцца ў паскораным рэжыме.

Лясны мёд багаты вітамінам С і антыаксідантамі, а таксама каліем, магніем і цынкам. Ён умацоўвае імунную сістэму, абараняе арганізм ад хвароб сэрца і лепш за ўсё лечыць кашаль. А яшчэ лясны мёд мае больш нізкі глікемічны індэкс, чым іншыя гатункі. Сланечнікавы мёд — выратаванне для гіпертонікаў: ён умацоўвае сценкі сасудаў.

Дзе купіць і як захоўваць

Колькі мёду купляюць за сезон? Прадавец Ірына тлумачыць, што адзін пакупнік, які вырашыў «назапасіць здароўе», сёння купляе ў сярэднім літр-паўтара мёду. Пенсіянеры бяруць некалькі слоічкаў рознага мёду — сабе, дзецям, унукам. Моладзь аддае перавагу «цукеркам» — мёду ў сотах (у сярэднім 3—5 рублёў за штучку). Наогул, сярэднестатыстычны пакупнік мёду — жанчына ва ўзросце 40+. Хоць набываюць мёд і мужчыны. Пакупнікі, маладзейшыя за 30, больш схільныя да ўсякага роду «вынаходстваў»: мёд з даданнем ягад (напрыклад, працёртай маліны) і арэхаў разлічаны ў большай ступені на іх.

Як жа праверыць, ці якасны мёд вам прапануюць? Спосабаў быццам шмат, але ні адзін з іх не дае стапрацэнтнай гарантыі.

Напрыклад, самы просты спосаб — капнуць кропельку мёду на ліст паперы. Калі кропля расцяклася, а вакол з'явілася мокрая пляма — мёд або няспелы, або разбаўлены вадой. Можна растварыць 1 чайную лыжку мёду ў цёплай або прахалоднай вадзе. Якасны мёд растворыцца цалкам, без асадка. Па інтэрнэце гуляюць «савецкія» спосабы з алоўкам або нагрэтым дротам. Але дакладна пацвердзіць, ці натуральны гэты мёд, пад сілу толькі лабараторнаму аналізу. Калі рабіць яго ў вашы планы не ўваходзіць, тады гэта — пытанне даверу да прадаўца. Таму лепш не купляць мёд на аўтатрасах або прыпынках грамадскага транспарту. Выбіраем буйныя рынкі, дзе адміністрацыя сочыць за якасцю тавару, або павільёны фірменнага гандлю пчаляроў (там звычайна пазначаны тэлефон і адрас вытворцы, і вас дакладна не падмануць).

Не лішнім будзе ведаць таксама, чым «сыры» мёд адрозніваецца ад пастэрызаванага (на той выпадак, калі вы аддаяце перавагу набыццю мёду ў гіпермаркетах). Пастэрызаваны мёд — нагрэты да 70 градусаў і астуджаны. Гэтая працэдура палягчае разліў, мёд становіцца прыгожым і празрыстым, яго крышталізацыя запавольваецца. Акрамя таго, пастэрызацыя забівае ўсе наяўныя ў мёдзе клеткі дражджэй, пасля чаго яго закісанне становіцца немагчымым. Праўда, пры пастэрызацыі мёд пазбаўляецца і большай часткі карысных уласцівасцяў.

Самы просты спосаб — капнуць кропельку мёду на ліст паперы. Калі кропля расцяклася, а вакол з'явілася мокрая пляма — мёд або няспелы, або разбаўлены вадой.

Агульнавядома, што якасны мёд павінен быць цягучы — сцякаць з лыжкі тоненькім струменьчыкам і не расцякацца, а як бы «ўкладвацца ў пірамідку». А вось «зацукрываецца» любы сапраўдны мёд: адзін гатунак раней, другі пазней (несапраўдны «цукровы мёд» якраз заўсёды застаецца вадкім). Ліпавы мёд крышталізуецца прыкладна праз 5-6 месяцаў, сланечнікавы (за кошт высокага ўтрымання глюкозы) — у тры-чатыры разы хутчэй. Мёд акацыі мае ў складзе шмат фруктозы, а таму не крышталізуецца каля 12 месяцаў. Калі мед зацукраваўся, вярнуць яму вадкі стан можна, нагрэўшы на вадзяной лазні, але не вышэй за 40 градусаў, каб не знішчыць біялагічна актыўныя рэчывы, якія змяшчаюцца ў ім.

— Захоўваць мёд у халадзільніку можна, — распавяла прадавец. — Няпраўда, што ад гэтага ён губляе карысныя ўласцівасці. У вуллях мёд пчолы захоўваюць і зімой, а тэмпература там — каля нуля градусаў. Так што ў халадзільніку або ў тым жа склепе, на зашклёным балконе, дзе няма мінусавых тэмператур, мёд захоўвае карысныя ўласцівасці.

Галоўныя ўмовы захоўвання мёду — герметычная ёмістасць (гэты прадукт лёгка ўбірае староннія пахі) і сухое паветра: павышаная вільготнасць можа прывесці да закісання мёду.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Центр Промышленной Оценки • ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ • ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. УНП 191021390**
Продавец	**ОАО «Сморгонский завод оптического станкостроения», Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, 80. УНП 500154362**

Предмет аукциона (одним лотом) – помещения административного корпуса 25.
Адрес: **Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, 80**

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инв. номер
Административное помещение	30,5 кв. м	443/D-11064
Административное помещение (1-2 этажи)	1675,5 кв. м	443/D-11065
Административное помещение (1-2 этажи и подвал)	777,9 кв. м	443/D-11066
Составные части и принадлежности: подвал (1А 1-2-8/п.к.)), покрытие асфальтобетон. площадь 2212,9 кв. м (а), подъездной путь асфальтобетон. площадь 231,2 кв. м (б), лестница бетон. площадь 130,6 кв. м (в), подпорная стена бутобетон. площадь 51,0 кв. м (г), покрытие из плитки цементно-песчаной площадь 747,5 кв. м (д), ограждение длина 9,10 м (е), ограждение длина 9,0 м (ж)		
«Конференц-зал» (1-2 этажи) (помещение культурно-просветительного и зрелищного назначения)	822,1 кв. м	443/D-11067
Административное помещение (1 этаж)	17,7 кв. м	443/D-11069
Административное помещение (3-4 этажи)	1880 кв. м	443/D-11070
Административное помещение (5-8 этажи)	2569,8 кв. м	443/D-11071
Трансформаторная подстанция (помещение неустановленного назначения)	75,2 кв. м	443/D-11072

Озеленение с инв. номером по бух. учету 2000078/12 в составе: многолетние насаждения (ель колючая голубая 2 шт., туя западная 14 шт., ива белая 3 шт., дерен белый 5 шт., арония черноплодная (живая изгородь) 187,0 м п., дерен белый, спирея иволистная (живая изгородь) 95,0 м п., туя западная 2 шт., туя западная шаровидная 3 шт., газон 0,25 га)

Сведения о земельном участке: общ. пл. **1,0145** га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания здания административного корпуса 25. Ограничения (обременения): водоохранные зоны рек, водоемов; охранные зоны электрических сетей (пл. 0,0096 га)

***Обременения*:** площади помещений (443/D-11070, 443/D-11067) частично сданы в аренду. Помещения с инв. №№ 443/D-11070, 443/D-11065 находятся в залоге у ОАО «Белагропромбанк». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона. После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

Начальная цена лота с НДС 20 % – 3 269 030,40 бел. руб. (снижена на 20 %)

Задаток 2 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**30** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1 % от итоговой цены продажи предмета аукциона** в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 07.07.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**04.10.2022** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**03.10.2022** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

